ПАНЯДЗЕЛАК 27 ЛІСТАПАДА 1933 г. № 273

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЧЛУЧАЙЦЕСЯ!

Адрес рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Воль. Пролетарыяту, 3-ці паверх. ПАДПІСНАЯ ЦЕНА 2 р. у месяц. Адна асобная нумар 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-78; кіраўн. рэдакцыі, парт. і масавы сектары 4-76; сектары прамысловы, сельска-гаспадарчы—72; рабоч. спасібнікі і карэспанд., сек. будаўніцтва нац. культурнага будаўніцтва 6-15, літ. рабочых і калгаснікаў, бюро расследаванняў — 2-00 кантора—55; навучан. рэдакцыя—4-56.

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ У НУМАРЫ:

СЕМНАЦАТЫ. Перадавы артыкул «ПРАВДЫ».

Аб абавязковай пастаўцы масла і малака дзяржаве ў 1934 г. Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б).

ЗА ГРАНІЦАЙ: Гнявебны крах паказанняў правака тараў.

СЕМНАЦЦАТЫ.

Апублікаванае ўчора ў «Правде» рашэнне Пленума Цэнтральнага Камітэта УсеКП(б) аб тэрміне адкрыцця і парадку дня XVII партыйнага з'езда —здзначная падзея ў жыцці партыі. Тры з лішнім гады прайшлі з часу апошняга партыйнага з'езда. Тэрмін нібыта вызначны, але які гістарычны этап пройдзены!

У палітычнай справаздачы XVI з'езду тав. СТАЛІН, аналізуючы бурны рост нашай гаспадаркі, папярэджваў тавыдушоў аб памылковых вывадах аб узроўні нашага прамысловага развіцця. Совецкі саюз прыняграў за станавіска краінай пераважна аграрнай, краінай адсталай у тэхнічна-эканамічных адносінах. „МЫ Д'ЯБАЛЬСКІ АДСТАЛІ Ў СЕНСЕ ЎЗРОЎНЯ РАЗВІЦЦЯ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ АД ПЕРАДАВЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН", такі вывад тав. СТАЛІНА ў 1930 г.

За мінуўшыя тры гады, літаральна на вачох дзесяткаў мільёнаў працоўных, адбылася найвялікшая рэволюцыя ва ўсіх галінах жыцця. Як чарадзічным жэзлам прыведзены ў рух магутныя прадукцыйныя сілы, якія ляжалі над спудам тысячагоддзяў. Пабудаваны буйнейшыя гіганты металургіі, энергетыкі, хіміі і машынабудаўніцтва, многія з якіх далёка апярэдзілі еўрапейскую тэхніку. СОВЕЦКІ САЮЗ ВЫСУНУЎСЯ Ў ПЕРШУЮ ШАРЭНГУ ПЕРАДАВЫХ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫХ КРАІН.

Нават у лепшыя часы свайго існавання капіталізм крохаборнічаў у параўнанні з велізарнейшымі тэмпамі ўздыма социялістычнай індустрыі. Наша машынабудаўнічая прамысловасць—гэта асноўная база социялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі—настолькі вырасла, што па абёму прадукцыі яна заняла другое месца ў свеце. Што датычыцца сельска гаспадарчага машынабудаўніцтва, то яно не толькі па абёму прадукцыі, але і па тэхнічнаму ўзроўню высунулася на ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў СВЕЦЕ. ГЭТЫ ПЕРВЯНЕЦ КРАІНЫ СОВЕТАЎ МОЖА РАПАРТАВАЦЬ XVII ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ АБ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ГІСТАРЫЧНАГА ЛОЗУНГА ПАРТЫІ—„ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ".

Прамысловасць сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва не выпадкова так рэзка высунулася ўперад. У міжз'езданьскі перыод Ленінскі ЦК згрупаваў усю сваю ўвагу на тым, каб ліквідаваць супярэчнасці паміж грамадскай формай вытворчасці ў прамысловасці—буйная социялістычная індустрыя—і грамадскай формай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы—дробнейшая, раздробленая сялянская гаспадарка, якая базуецца на самай примітыўнай тэхніцы. Гэта задача не магла быць вырашана без насаджэння перадавой індустрыі, якая вытварае ў масавым маштабе складаныя сельска-гаспадарчыя машыны і трактары.

Сотні тысяч трактараў і складаных сельска гаспадарчых машын работаюць зараз на социялістычных палях. Калгасны лад, ліквідаваўшы ў асноўным кулацтва як клас, перамог бесаваротна. Толькі за 10 месяцаў бягучага года ўступіла у калгасы маля мільёна сялянскіх гаспадарак. Плуг рэвалюцыі так перараў социялістычныя палі, што ўсе карэнні капіталізма на вёсцы канчаткова падарваны. Арганізаваныя паніцыяты на тав СТАЛІНА палітаддзелы МТС і совгасаў забяспечылі разгром кулацкіх недабіткаў, стварылі моцны фундамент для росквіту социялістычнага земляробства. ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ КАЛГАСАЎ ператвараючы ў жыццё лозунг правадыра, ужо ў бягучым годзе СТАЛІ БОЛЬШЭВІЦКІМІ, А ІХ КАЛГАСНІКІ ЗАМОЖНЫМІ.

Социялістычная рэканструкцыя народнай гаспадаркі суправаджаецца вялізарнейшым ростам раздзялення працы. Асабліва навочна гэта бачна ў сельскай гаспадарцы. Калі раней аднаасобнік капаўся на сваім карліковым участку, сам араў, сеяў, убіраў хлеб, рамантаваў нескладаны інвентар даглядаў жывёлу,—словам, адзін рабіў усе розныя сельска-гаспадарчыя аперацыі, то зараз карціна рэзка змянілася. Трактарысты, камбайнеры, механікі, брыгадзіры, дзільшчыцы і г. д.—помімо сведчанне МАСАВАЙ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ розных вытворчых працэсаў. Гэта спрыяе якаснаму росту калгасной вытворчасці і рэзкаму падвышэнню прадукцыйнасці працы. Новая форма супрацоўніцтва палегчыла работу селяніна-труженіка. КАЛГАС СТВАРЫЎ НОВУЮ, БОЛЬШ ВЫСОКУЮ ВЫТВОРЧУЮ СІЛУ, ЯКАЯ Ў МНОГІМ ПЕРАВЫШАЕ МЕХАНІЧНУЮ СУМУ АСОБНЫХ ВЫТВОРЧЫХ СІЛ, ЯКІЯ АБ'ЯДНАЛІСЯ Ў КАЛЕКТЫВЫ.

«Раздзяленне працы...—указваюць Маркс і Энгельс у «немецкой идеологіі»,—прыводзіць да аддзялення прамысловай і гандлёвай працы ад працы земляробчай і, тым самым, да аддзялення ГОРАДА АД ВЁСКІ і да супрацьлегласці інтарэсаў». Гэта ва ўмовах капіталізма. Працэсы раздзялення працы ў социялістычнай гаспадарцы, якія базуюцца на магутным росце тэхнікі і новых формах вытворчых адносін людзей, суправаджаюцца іншымі рэзультатамі. Дзесяткі мільёнаў сялян сталі на шлях арганізацыі калектыўнай гаспадаркі, падняслі прадукцыйнасць працы і свой узровень жыцця. Як ніколі ў гісторыі, працоўныя сяляне, аб'яднаныя зараз у калгасах, наблізіліся да рабочага класа. СУПРОЦЬЛЕГЛАСЦЬ ПАМІЖ ГОРАДАМ І ВЁСКАЙ, ЯКАЯ БАЗУЕЦЦА НА ПРЫВАТНАЙ УЛАСНАСЦІ ВА СРОДКІ ВЫТВОРЧАСЦІ, УСЁ БОЛЬШ СЦІРАЕЦЦА.

Тэзісы ЛЕНІНА і СТАЛІНА аб магчымасці пабудовы поўнага социялістычнага грамадства ў адной, асобнай узятай краіне, якая падверглася жорсткай атацы трацкістаў і апартуністаў у іх мясцей, бліскуча вытрымала гістарычнае выпрабаванне. Яна з'яўляецца КРАЯВУГОЛЬНЫМ КАМЕНЕМ ва ўсёй нашай рабоце. Заслуга тав. Сталіна, які з класічнай чоткасцю распрацаваў гэта важнейшае пытанне тэорыі пролетарскай рэволюцыі, заключаецца і ў тым, што ён УЗНЯЎ УСЮ ПАРТЫЮ НА АБАРОНУ ГЭТАЙ НОВАЙ ЗАВАЁВЫ НАВУКОВАГА СОЦЫЯЛІЗМА І РАЗГРАМІЎ УСІХ І ЎСЯКІХ АПАРТУНІСТАЎ, ВОРАГАЎ ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ.

Аб лёсе рэволюцыі, аб двух шляхах развіцця Совецкага саюза ішла прамова: назад—да капіталізма, ці ўперад—да социялізма! ТРЫУМФ БОЛЬШЭВІЦКІХ ПЕРАМОГ ЁСЦЬ І ТРЫУМФ НАШАГА ЛЮБІМАГА ПРАВАДЫРА т. СТАЛІНА, НАЙВЯЛІКШАГА ТЭАРЭТЫКА НАШАГА ЧАСА, НЕЗМЕННА ВЕРНАГА РУЛЯВОГА ПЕРАМОЖНАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

У другой пяцігодцы народныя масы Совецкага саюза канчаткова ліквідуюць кулацтва, як клас і завяршаюць суцэльную калектывізацыю. Сістэма пяці славутых ленінскіх укладаў, якія характарызавалі вашу эканоміку пасля Кастрычніка, сярод якіх яўна пераважала дробна-буржуазная стыхія, уходзіць з гістарычнай арэны. Не будзе больш прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці XVII партыйны з'езд вынясе ёй канчатковы прыгавор. Другая пяцігодка поўнасцю знішчыць прычыны, якія параджаюць класавую розніцу і эксплоатацыю. ГРАМАДСКАЯ ЎЛАСНАСЦЬ З'ЯВІЦЦА АДЗІНАЙ ФОРМАЙ УЛАСНАСЦІ ВА ЎСЁЙ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫІ

Вялікія задачы рабочага класа ў другой пяцігодцы. Нам прадстаіць завяршыць тэхнічную рэканструкцыю ўсёй народнай гаспадаркі сіламі ўласнай цяжкай прамысловасці, што патрабуе велізарнейшых капітальных укладанняў. Гэта значыць, што мы павінны НЕ ТОЛЬКІ ЎМЕЦЬ ДОБРА БУДАВАЦЬ НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, АЛЁ І АСВОІЦЬ ПЕРАДАВУЮ ТЭХНІКУ. „Гэта значыць, што другая пяцігодка, калі яна хоча разлічвацца на сур'ёзны поспех, павінна дапоўніць сучасны лозунг НОВАГА БУДАЎНІЦТВА новым лозунгам АСВАЕННЯ новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі" (з рэзалюцыі студзеньскага пленума ЦК і ЦКК). У гэтым зараз цвік пытання!

Капіталізм з яго канкурэнцыяй, анархіяй вытворчасці і крызісамі бязмерна растачае рабочую сілу і сродкі вытворчасці. Планавая гаспадарка, апрача ўсяго іншага, дазваляе, пры адноўкавай затрэце сродкаў, атрымаць значна большы, чым на ўмовах капіталізма, вытворчы эфект Досыць спаслацца хаця-б на такі агульнавядомы факт, што Совецкі саюз, які не абагнаў яшчэ перадавыя краіны Эўропы па ўзроўню тэхнікі, заняў ужо ў канцы першай пяцігодкі другое месца ў свеце па валавой прадукцыі прамысловасці. Тут адбіўся не толькі рэсту крызіс у капіталістычных краінах, як мяркуюць некаторыя таварышы. Тут адбіліся і перавагі планавага скарыстання вытворчага апарата Совецкага саюза.

Барацьба за асваенне новай тэхнікі адкрывае перад намі невычарпальныя рэзервы, якія дазволяць паўней скарыстаць перавагі социялістычнай сістэмы, хутчэй ажыццяўляць задачу дагнаць і перагнаць». На вопыце Сталінградскага і Харкаўскага трактарных заводаў, на вопыце Масоўскага і Горкаўскага аўтамабільных, уся краіна праходзіць навочны ўрок—што дае аўладанне вытворчай магутнасцю прадпрыемстваў. Гэтыя заводы выпускаюць зараз трактараў і аўтамабіляў у два-тры разы больш, чым у першы перыод іх пуска. Зразумела, пры нізменнай колькасці вар штатаў і, бадай, меншай колькасці рабочых.

Тэхнікай мы абавязаны аўладаць на ўсіх без выключэння участках—у новым будаўніцтве, у прамысловасці на транспарце, у калгасах і совгасах. Нашым эканамістам было-б не грэх падлічыць, колькі дзесяткаў тысяч трактараў грузавых машын, аўтамабіляў, паравозаў, вагонаў і г. д. атрымае краіна (у літаральным сенсе слова без асобых затрат), калі рабочыя і калгаснікі па сапраўднаму, як належыць гаспадарам, навучацца абыходзіцца з гэтымі машынамі і аўладаюць вытворчым апаратам, створаным у першай пяцігодцы.

Пагэтаму лепшым, бадай, падарункам для XVII партыйнага з'езда будзе сур'ёзная работа нашых партыйных арганізацый на гэтым адказным участку. МАСАВЫ ПАХОД ЗА АЎЛАДАННЕ ТЭХНІКАЙ, ПАДРЫХТОЎКА ТРАКТАРЫСТАЎ І КАМБАЙНЕРАЎ, УСЯМЕРНАЯ ПАДТРЫМКА ІНІЦЫЯТЫВЫ КОМСАМОЛА, АРГАНІЗОЎВАЮЧАГА „ТЭХНІЧНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ", АБАВЯЗКОВАЕ НАВУЧАННЕ РАБОЧЫХ ТЭХНІЧНАМУ МІНІМУМУ,—вось што зараз патрабуецца. Гэта не зможа не адбіцца на росце прадукцыйнасці працы, зніжэнні сабекошта і паляпшанні ўсіх якасных паказальнікаў вытворча-фінансавага плана!

Вялікае развіццё атрымае лёгкая і харчовая індустрыя. Першы год другой пяцігодкі суправаджаецца новым магутным уздымам прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Упяршыню за гады рэволюцыі цяжкая прамысловасць ліквідавала сезоннае зніжэнне вытворчасці ў летні перыод, упяршыню за гады рэволюцыі дзесяткі мільёнаў калгаснікаў на справе ўклучыліся ў работу па сур'ёзнаму ўздыму социялістычнага земляробства і дабілі я рэкорднага ўраджая.

Сапраўдны вытворчы энтузіязм рабочых і калгаснікаў павялічыў н шы рэсурсы і дае магчымасць ужо зараз рэзка павысіць матэрыяльны ўзровень і культурныя ўмовы жыцця працоўных. Пачаўшаяся спаборніцтва гарадоў і рабочых пасёлкаў па ўзорным комунальным абслугоўванні, пабудове новых лазняў рамонце жылля, забрукаванні вуліц і г. д. трэба ўся мерна падтрымаць і развіць. ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ.—заявіў тав. Сталін у гутарцы з дэлегацыяй перадавых калгаснікаў Адэскай вобласці,—МЫ БУДЗЕМ ВЫПУСКАЦЬ АДГЭТУЛЬ У ДВА І ТРЫ РАЗЫ БОЛЬШ.

Многае можа зрабіць у гэтых адносінах і МЯСЦОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ. Гэта павялічыць нашы сілы і адкрые непачаты край новых магчымасцяй роста дабрабыта працоўных. Мясцовыя выканкомы, партыйныя арганізацыі, слова за вамі! Сустракайце партыйны з'езд большэвіцкай справай масавага развіцця сваёй прамысловасці, скары стайце маючыяся рэсурсы, знайдзіце новыя!

Асоба стаіць пытанне аб якасці прадукцыі нашай лёгкай індустрыі. Вы раслі запытанні рабочых і калгаснікаў, яны патрабуюць тавараў лепшай якасці. Прамысловасць, якая абслугоўвае шырокі рынак, абавязана сур'ёзна падцягнуцца.

Тысячу раз правы калгаснікі Георгіеўскага раёна, калі яны ў лісце да тав. Сталіна заявілі:

„Таварыць не прыходзіцца, тавараў стала цяпер больш. Вось і ў нашым кааператыве паліцы запоўнены. Але ў тым бяда, што тавары не заўсёды надыходзячыя. Тавараў многа, а выбраць іногды няма чаго, не пагусту. А самае галоўнае—якасць дрэнная. Нас не задавальняе ўжо абы які небудзь паркаль ці якія небудзь боты, ці поўшалак, скажам, а каб усё было добрае, высокай якасці. КАЛІ САЦІН, ДЫК КАБ САПРАЎДЫ САЦІН, ШАЛЬ—ДЫК ШАЛЬ, БОТЫ—ДЫК БОТЫ, КАБ ДУША ЦЕШЫЛАСЯ".

І партыя моцна спытае з тых работнікаў прамысловасці і кааперацыі, якія не перабудуюць сваёй работы, каб задаволіць справядлівыя патрэбаванні рабочых і калгаснікаў. Партыйнасць людзей, закліканых абслугоўваць шырокага спажыўца, азначае сёння: РАБОТАЙ ЧЭСНА І ДОБРА СУМЛЕННА, ПОУНАСЦЮ ВЫКОНВАЙ ПЛАН, ЗНІЖАЙ САБЕКОШТ, ВЫТВАРАЙ ТАВАРЫ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ, ВЯДЗІ КУЛЬТУРНЫ СОВЕЦКІ ГАНДАЛЫ

Недаацэнка арганізацыйнага пытання—вось прычына адставання асобных участкаў. Некаторыя таварышы думаюць што гэта незначнае пытанне. Глыбока яны памыляюцца. Пасля таго, як генеральная лінія партыі атрымала гістарычную праверку, цэнтр цяжара—у арганізацыі справы, у правільнай расстаноўцы людзей у арганізацыі мас На прыкладах Донбаса, на прыкладах барацьбы з канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва ёсць чаму павучыцца і партыйным і гаспадарчым работнікам. Партыйны з'езд падагуліць усю работу, праведзеную партыяй у гэтым напрамку, і вызначыць новыя крокі да канчатковага замацавання ленінскага стыля работы ў новых умовах

XVII партыйны з'езд мы сустракаем у выключна спрыяльнай міжнароднай і ўнутранай абстаноўцы. Моцна і непахісна дыктатура пролетарыята. Гаспадарчая, палітычная і ваенная магутнасць краіны нязмерна вырасла. Совецкі саюз атрымаў бліскучыя перамогі на міжнародным арэне, асабліва за апошні год. Буйнейшыя краіны Эўропы і нашы непасрэдныя суседзі вымушаны былі заключыць з намі пакты аб ненападзе Не магла ўтрымацца на старых пазіцыях „не прызнання" і самая буйная капіталістычная краіна—ПАЗШ. 16 гадовыя традыцыі былі зламаны і ПАЗШ устанавілі з намі нармальныя дыпломатычныя адносіны.

Прадбачлівасць Ленінскага ЦК забяспечыла не толькі перамогі першай пяцігодкі, але і заклала аснову для далейшага трыумфа социялізма. Совецкі саюз стаў непрыступнай цытаделлю міжнароднай пролетарскай рэволюцыі. ПАРТЫЯ ПА-СТАЛІНСКУ ЎЗБРОІЛА ЗАВАЁВЫ КАСТРЫЧНІКА, І ГОРА ТЫМ АВАНТУРЫСЦКІМ КОЛАМ ІМПЕРЫЯЛІЗМА НА ЎСХОДЗЕ І НА ЗАХАДЗЕ, ЯКІЯ ПАСПРАБУЮЦЬ ПАСЯГНУЦЬ НА НЕДАТЫКАЛЬНАСЦЬ СОВЕЦКІХ МЕЖАЎ!

Не на тэрыторыі рабочых і сялян вялікай Краіны Совецкіх прыдзецца весці вайну. Сталёвай сцяной усіх радоў зброі сучаснага боя сустрэне іх рэволюцыйная Чырвоная армія рабочых, калгаснікаў і працоўных нашай краіны. Поўны разгром на фронце, пролетарская рэволюцыя ў тылу,—вось што забяспечыць большэвікі ўсім тым, хто нападзе на краіну пролетарскай дыктатуры.

МІРНАЯ ПАЛІТЫКА БЫЛА, ЁСЦЬ І БУДЗЕ ПАЛІТЫКАЙ СССР. Але мы ведаем і тое, што занадта многа ахвотнікаў сярод імперыялістаў выразшыць свае пяжкасці за кошт Совецкага саюза. Пагэтаму непахісны большэвіцкі заклік: рабочыя, калгаснікі і працоўныя краіны Советаў, мацуйце магутнасць непераможнай Чырвонай арміі.

Выключную ўвагу мы ўдзялім у другой пяцігодцы пытанням чыгуначнага транспарта. Ад яго становішча залежыць работа нашай прамысловасці. На сёняшні дзень транспарт—вузкае месца ў народнай гаспадарцы. Ён не задавальняе нашым новым патрабаванням. Сюды, на гэты адказнейшы ўчастак партыя кідае максімум сіл і сродкаў у другой пяцігодцы. І транспарт будзе ператвораны ва ўзорны ўчастак социялістычнай гаспадаркі.

XVII партыйны з'езд з'яўляецца з'ездам пабудовы бескл савага социялістычнага грамадства. Тое, аб чым марылі лепшыя людзі чалавецтва, за што гінулі ў турмах і на барыкадах перадавыя пролетарыі будзе жыцця пяцілена СОВЕЦКІ САЮЗ СТАНЕ ПЕРШАЙ КРАІНАЙ ВЯЛІКАГА БЕСКЛАСАВАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА.

У барацьбе з контррэволюцыйным троцкізмам, з правым ухілам, які ўзначальваўся тт БУХАРЫНЫМ, РЫКАВЫМ І ТОМСКІМ, з права-лявацкім блокам СЫРЦОВА—ЛОМІНАДЗЕ, з заядлымі апартуністамі і двурушнікамі тыпа СЛЯПКОВА—РУЦІНА, ЭЙСМОНТА—СМІРНОВА партыя наблі жаецца да пераможнага фініша—пабудовы социялістычнага грамадства.

Есць пытанні, па поваду якіх у радах большэвіцкай партыі не спрачаюцца: „ПЫСКУС РАВАЦЬ ІХ У МЕЖАХ ПАРТЫІ АЗНАЧАЛА-Б ПАСТАВІЦЬ ПАД ПЫТАННЕ ЎВЕСЬ ПРОЛЕТАРСКІ СОЦЫЯЛІЗМ" (Энгельс). Той, хто не засвоіў безагаворачна пролетарскага светапогляда, хто працягвае весці антыленінскую, кулацкую лінію, хто падрывае жалезную партыйную дысцыпліну, хто думае адсядзецца,—таму не месца ў радах партыі. І такіх малайцоў, такіх апартуністаў, двурушнікаў, палітычных бандытаў партыя выганяе са сваіх радоў. Аб гэтым красамоўна гаворыць першыя вынікі чысткі партыі.

Пабудова социялістычнага грамадства ў другой пяцігодцы патрабуе рашучай барацьбы з рэшткамі кулацтва, з апартунізмам. Апошні і рашучы штурм не можа не выклікаць аб вастрэння класавай барацьбы на асобных участках. Пагэтаму неабходны ПАДВЫШЭННЕ КЛАСАВАЙ ПІЛЬНАСЦІ, БЯЗЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА З АПАРТУНІЗМАМ, З ПРАВЫМ ЎХІЛАМ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ.

Набліжаюцца тэрміны XVII з'езда. Гэта абавязвае партыйныя арганізацыі разгарнуць масавую работу па падрыхтоўцы да з'езда, энергічна разгарнуць самакрытыку і знішчыць усе недахопы, адзначаныя ў час чысткі. Партыйныя арганізацыі павінны падвесці вынікі сваёй работы і работы партыі за міжз'ездаўскі перыод.

Ніколі, ні ў якія гады, партыя не была так адзіна і так манолітна так ідэйна спаяна, як цяпер—да XVII партыйнага з'езда.

Ніколі яна не акружала такім цесным кальцом сваё кіраўніцтва, прай шоўшае найвялікшую гістарычную праверку дзесяці год работы без Леніна.

ТОЛЬКІ ДА КАНЦА РЭВОЛЮЦЫЙНЫ КЛАС—ПРОЛЕТАРЫЯТ МОГ ВЫСУНУЦЬ ТАКУЮ ПЛЕЯДУ ПРАВАДЫРОЎ, ЯК МАРКС І ЭНГЕЛЬС, ЛЕНІН І СТАЛІН.

Сапраўды, справа рабочага класа, справа вялікага Кастрычніка непераможна!

Кастрычнік пераможа ва ўсім свеце!

(Перадавы артыкул «Правды»).

Аб абавязковай пастаўцы малака і масла дзяржаве у 1934 г.

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА УсеКП(б).

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Устанавіць на 1934 г. (з 1-га студзеня па 31 снежня) ніжэйнаступныя сярэднія па рэспубліках, краях і абласцях нормы абавязковай, маючай сілу падатка, пастаўкі малака дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах, асобна для калгасных двароў у калгасах, маючых малочна тваравыя фермы, асобна для калгасных двароў у калгасах, не маючых малочна-тваравых ферм, і асобна для аднаасобных сялянскіх гаспадарак (у літрах на 1 карову ў год):

РАЁНЫ	Для аднаасобных сялянскіх гаспадарак.	Для калгасных двароў у калгасах, не маючых малочна-тваравых фермаў.	Для калгасных двароў у калгасах, маючых малочна тваравыя фермы.
I. ГРУПА.			
Паўночны край	280	220	180
Заходняя-Сібірскі край			
Уральская вобласць			
Іванаўская вобласць			
II. ГРУПА.			
Ленінградская вобласць	250	180	150
Маскоўская вобласць			
Заходняя вобласць			
Паўночна-Каўказскі край			
Башкірская АССР			
Татарская АССР			
III. ГРУПА			
Цэнтральна-чарназемная вобласць	170	110	80
Украінская ССР			
Горкаўскі край			
Беларуская ССР			
Сярэдняя-Волжскі край			
Ніжняя Волжскі край			
Казанская АССР			
Усходняя Сібірскі край			
Далёка Ўсходні край			
IV. ГРУПА.			
Крымская АССР	120	75	50
Карэльская АССР			
Горныя раёны Паўночнага Каўказа			
Закаўказская СФСР	За выключэннем вандроўных раёнаў		
Калмыцкая аўт. вобласць			
Кіргізская АССР			
Узбекская ССР			
Туркменская ССР			
Таджыкская ССР			
Якутская АССР			

2. Устанавіць для малочна-тваравых фермаў і для агрэгаджанага стада калгасаў наступныя нормы абавязковай, маючай сілу падатка, пастаўкі малака дзяржаве (у літрах з каровы ў год):

РАЁНЫ	Малочна-тваравыя фермы і агрэгаджанае стада калгасаў.
I ГРУПА	
Паўночны край	580
Заходняя Сібірскі край	
Уральская вобласць	
Іванаўская вобласць	
Паўночна-Каўказскі край	
II. ГРУПА.	
Ленінградская вобласць	520
Маскоўская вобласць	
Заходняя вобласць	
Башкірская АССР	
Татарская АССР	
III. ГРУПА.	
Цэнтральна-чарназемная вобласць	470
Сярэдняя Волжскі край	
Украінская ССР	
Беларуская ССР	
Горкаўскі край	
Ніжняя-Волжскі край	
Казанская АССР	
Усходняя Сібірскі край	
Далёка Ўсходні край	
IV. ГРУПА.	
Крымская АССР	358
Карэльская АССР	
Горныя раёны Паўночнага Каўказа	
Закаўказская СФСР	За выключэннем вандроўных раёнаў
Калмыцкая аўт. вобласць	
Кіргізская АССР	
Узбекская ССР	
Туркменская ССР	
Таджыкская ССР	
Якуцкая АССР	

3. Размер пастаўкі малака малочна-тваравымі фермамі, калгасамі (у тым ліку комунамі) і аднаасобнымі гаспадаркамі вызначаецца на наяўнасці кароў на 1 XI—1933 г.

За ўтойванне сапраўднага пагалоўя жывёлы ў агрэгаджаным стадзе калгасаў і калгасных тваравых фермах устанавіць крымінальную адказнасць старшынь праўленняў калгасаў і загадчыкаў жывёлагадоўчых тваравых ферм калгасаў па арт. 62 крымінальнага кодэкса РСФСР і адпаведных артыкулах крымінальных кодэксаў іншых рэспублік.

4. У раёнах, дзе няма масларобча-сыраварных заводаў за выключэннем суцэльна малочных раёнаў, выкананне абавязацельстваў аднаасобнікамі, калгасамі і калгаснымі дварамі робіцца топленым маслам з разліку 1 кгр масла на 25 літраў малака.

5. Устанавіць наступныя каляндарныя тэрміны пастаўкі малака дзяржаве калгасамі (у тым ліку комунамі), калгаснымі дварамі і аднаасобнымі гаспадаркамі ў процентах ад гадавых норм: указаных, у п. п. 1 і 2 данай пастановы:

РАЁНЫ:	I кварт.	II кварт.	III кварт.	IV кварт.
Паўночны край . . . . Ленінградская вобласць . і Карэльская АССР . . . Заходняя вобласць . . . Іванаўская вобласць . . Маскоўская вобласць . . Беларуская ССР	20	40	30	10
Паўночна Каўказскі край Ніжняя Волжскі край . . Уральская вобласць . . Украінская ССР . . . . Крымская АССР	15	35	40	10
Горкаўскі край . . . . Заходняя-Сібірскі край . .	15	40	35	10
Башкірская АССР . . . Татарская АССР	10	40	40	10
Цэнтральна. чарназ. вобл. . Сярэдняя Волжскі край .	10	35	40	15
Казанская АССР . . . . Кіргізская АССР . . . . Усходняя-Сібірскі край . Далёка-Ўсходні край . .	10	35	45	10
БССР	5	45	45	5

6 Прапанаваць совнаркомам саюзных і аўтаномных рэспублік і краёвым (абласным) выканкомам устанавіць асобныя нормы здачы па раёнах з тым, каб зацверджаныя гэтай пастановай сярэдняя нормы па вобласці, краю і рэспубліцы былі захаваны і выкананне плана здачы масла дзяржаве было поўнасцю забяспечана.

Пасля зацверджання парайённых норм здачы Наркамснабам СССР апублікаваць іх у мясцовым друку.

Бязумоўна забараняецца мясцовым органам улады змяняць зацверджаныя Наркамснабам СССР параёнаныя нормы пастаўкі малака дзяржаве для калгасных ферм, агрэгаджанага стада калгасаў, комун, калгасных двароў і аднаасобных гаспадарак.

7. Абавязаць старшынь сельсоветаў і райвыканкомаў пад адказнасць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, краёв аблвыканкомаў не пазней 25-га снежня ўручыць кожнай малочна-тваравай ферме, калгасу і комуне з агрэгаджаным стадам, калгаснаму двару і аднаасобнай гаспадарцы, маючай кароў, абавязацельства па пастаўцы малака з указаннем пункта пастаўкі і з разбіўкай гадавой нормы пастаўкі па месяцах у адпаведнасці з устаноўленымі для раёнаў квартальнымі планамі за атвак.

8. Абавязаць старшынь сельсоветаў весці ўлік выканання калгасамі, калгаснымі дварамі і аднаасобнымі гаспадаркамі ўстаноўленых для іх абавязацельстваў па пастаўцы малака дзяржаве.

9. Калгасы, калгасныя дворы і аднаасобныя гаспадаркі, не выконваючыя месячных абавязацельстваў па пастаўцы малака дзяржаве, падвергаюцца грашоваму штрафу ў памеры рынкавага кошта недавыкананай часткі абавязацельстваў са спагнаннем названай часткі малака ў бясспрэчным парадку ў наступным месяцы звыш норм здачы гэтага месяца

10. Абавязаць дырэктароў маслазаводаў варочаць здачыкам малака адыходы ад перапрацоўкі малака на масла (обрат) у колькасці: малочна тваравым фермам, калгасам (у тым ліку комунам) з агрэгаджаным стадам—50 проц. ад вагі зданага малака.

Іншым гаспадаркам—35 проц. ад вагі зданага малака.

11. Загатоўку малака і масла ў парадку данай пастановы ўскласці на масла-сыра заводы і адзіныя пункты Наркамснаба СССР і Цэнтрасаюза.

12 Устанавіць адказнасць па арт. 163 Кр к РСФСР і адпаведных артыкулах кодэксаў іншых рэспублік за спробу здаваць знятае, фальсіфікаванае (з прымешкамі) малако ў лік выканання абавязацельстваў, устаноўленых данай пастановай.

13. Прапанаваць Наркамснабу СССР па ўзгадненню з Цэнтрасаюзам зацвердзіць сілы раёнаў загатовак цельнага малака для спажэння прамысловых цэнтраў і размеркавання раёнаў загатовак паміж трэстамі Галоўмалако і Цэнтрасаюзам.

14. Практычнае правядзенне ў жыццё данай пастановы ўскласці на Наркамснаб СССР і на яго ўпаўнаважаных у рэспубліках, краях і абласцях.

15. Бязумоўна забараніць мясцовым органам улады, а таксама загатоўчым арганізацыям ускладаць на калгасныя тваравыя фермы і агрэгаджанае стада калгасаў, на калгаснікаў і аднаасобнікаў абавязацельствы па пастаўцы малака дзяржаве ў размерах, перавышаючых нормы здачы, апублікаваныя ў адпаведнасці з данай пастановай. Забараніць таксама давать далагковыя ці сустрэчныя планы па пастаўцы малака гаспадаркам, дапушчаюча выкананьшым свае абавязацельствы, забяспечаўшы акуратным здачыкам поўную магчымасць свабодна распараджацца лішкамі сваёй прадукцыі па свайму погляду.

Папярэдзіць усе партыйныя і совецкія арганізацыі, што асобы, вінаватыя ў дачы сустрэчных планаў, будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці

Старшыня СНК СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

22 лістапада 1933 года.

ТРЭЦІ РАЁННЫ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

АДКРЫВАЕЦЦА 28 ЛІСТАПАДА Ў 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА Ў БЕЛДЗЯРЖТЭАТРЫ.

НА АБВЕСТЦЫ ДНЯ З'ЕЗДА:

1. Гаспадарча

Завочная нарада сакратароў парткалектываў і ячэек прадпрыемстваў, калгасаў, совгасаў, совецкіх і навучальных устаноў і парторгаў.

ПРАВОДЗІМ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ ЗАВОЧНУЮ НАРАДУ.

АБВЕСТКА ДНЯ: абмен вопытам перабудовы партмасавай работы ў цэху, калгасе, брыгадзе, на вытворчым участку.

ДРУГІ ДЗЕНЬ.

Чым дыша наша ячэйка

Выступленне на завочнай нарадзе сакратара партыйнай ячэйкі КАВАЛЬНАГА ЦЭХА завода „Чырвоны металіст“ т. ПЛАВІНСКАГА.

Старшыня: Другое пасяджэнне нашай завочнай нарады на старонках газеты „Віцебскі пролетарый“ па абмену вопытам у перабудове партыйна масавай работы—лічу адкрытым.

Па парадку запісаўшыхся ў спрэчках слова мае сакратар партыйнай ячэйкі кавальнага цэха завода «Чырвоны металіст» т. ПЛАВІНСКІ.

Плавінскі: У ячэйцы кавальнага цэха завода «Чырвоны металіст» я работаю сакратаром вось ужо два месяца. У ходзе работы ячэйкі я лічу, што ўвайшоў дастаткова.

Голас з месца тав. Конюхава: (член бюро парткалектыва завода «Чырвоны металіст»). А ты т. Плавінскі, без агульных уступных, кажы па канкрэтней.

Плавінскі: Ды вось канкрэтна. Да чысткі партыі ў нашай ячэйцы нязіх партгруп не было. Пасля ж чысткі нашай ячэйкі мы перабудаваліся. Зараз у нас арганізавана і існуе дзве партыйных групы. Партгрупа т. БРЫКМАНА, якая аб'ядноае 8 членаў і кандыдатаў партыі і партгрупа т. Дынфельда, у якой знаходзіцца 12 членаў і кандыдатаў партыі і 3 спачуваючых.

Усяго ў нашай ячэйцы налічваецца членаў партыі 12, кандыдатаў 8, спачуваючых 3. Гэта таварышы, якія работаюць непасрэдна ў цэху 14 з іх заняты непасрэдна у варштата і 9 на розных адміністрацыйна-гаспадарчых, камандных работах кавальнага цэха. Акрамя гэтага мы маем чатырох прымацаваных, гэта т.т. Бжозе, Гаўрылычык (загадчык агітмас аддзелам гаркома партыі, Конюхаў (рэдактар шматтыражкі «Металіст») і Каралёў (старшыня завкома нашага завода).

Вялікую ўвагу наша ячэйка аддала пытанню расстаноўкі партыйных сіл у цэху. Усе члены і кандыдаты партыі нашай ячэйкі маюць нагрузкі. Сілы партыйныя ў цэху расстаўлены так, каб забяспечыць партыйна-масавую работу на кожным вытворчым участку, ва ўсіх зменах.

Голас з месца Тав. Плавінскі! У вас усяго дзве партыйных групы, скажы калі ласка, як-жа вам удаецца забяспечыць партыйна-масавую работу на ўсіх вытворчых участках, у брыгадах.

Плавінскі: Акрамя партыйных груп У НАС ВЫЛУЧАНЫ ПАЗМЕННЫЯ ПАРТОРГІ. Яны і забяспечваюць партыйна-масавую работу па зменах і па брыгадах. Так. напрыклад член партыі т. БЛЯХМАН адказвае за партыйна-масавую работу на першым участку рэзкі метала: т т. ПІШКОЎ і ШАШКОЎ адказваюць за праведзенне партыйна-масавай работы на тых зменах, дзе яны работаюць і г. д.

Тут, на нарадзе, я павінен з усёй рэзкасцю падкрэсліць, што не гледзячы на тое, што партыйна-масавая работа ў нашай ячэйцы перабудавана і што бюро партыйнай ячэйкі ўважліва размеркавала нагрузкі паміж членамі і кандыдатамі партыі, ёсць і на сённяшні дзень у нашай ячэйцы людзі, якія толькі фармальна лічацца не членамі на самай-жа справе работы ў ячэйцы не праводзяць. Такімі з'яўляюцца тт. ПАНІЧАЎ, БЖОЗЕ, КАРАЛЁЎ. Тав. Бжозе я сам два разы даручаў правесці работу па марксіцка-ленінскаму выхаванню, абодвы разы ён абяцаў і абодвы разы падвёў. Наперад нам патрэбна будзе самым рашучым чынам патрабаваць адказнасці за выкананне партыйных нагрузак і даручэнняў ад усіх партыйцаў, якія лічацца членамі нашай ячэйкі.

Старшыня: А зараз ты тав. Плавінскі раскажы, як вы работаеце в парторгамі.

Плавінскі: З парторгамі мы праводзім па лініі ячэйкі наступную работу: акуратна, хоць, трэба прызнацца, унепланава, як толькі нам выдаецца вольны час склікаем іх, інструктуем, адначасова заслухоўваем інфармацыю аб іх рабоце. Тут-жа на гэтых кароткіх інструкцыйных нарадах даем канкрэтныя заданні парторгам з вызначэннем часу, за які яны гэтыя заданні павінны «правярнуць» на сваіх зменах, участках, па брыгадах.

Парторгі дзеляцца вопытам сваёй работы на гэтых нашых кароткіх нарадах. Вось напрыклад, парторг змены т. Сандлер. Ён атрымаў заданне ад ячэйкі ахапіць падпіскай па ўкладах у ашчадкасу ўсіх рабочых сваёй змены, участка, брыгады. Тав. Сандлер шляхам разгорнутага шырокага спаборніцтва сярод рабочых заданне выканаў. Тут жа пасля гэтага была склікана нарада парторгаў, Сандлер зрабіў кароценькую інфармацыю, пасля чаго нарада падагуліла яго вопыт работы і перадала іншым парторгам. Такія нарады вельмі карысны, парторгі нашай ячэйкі імі вельмі здаволены. Такія нарады мы будзем практыкаваць і ўперад.

Работа нашай партыйнай ячэйкі праходзіць па плану. Планы мы складаем на месяц. Імі мы прадугледжваем асноўныя пытанні, якія вырашаем на працягу месяца на сходах ячэйкі і пасяджэннях бюро. Акрамя гэтага планам нашай ячэйкі вызначана работа партыйных груп, партшкол, палітгурткоў, тэхгурткоў і работа грамадскіх арганізацый.

Усяго ў нашым цэху арганізавана 9 брыгад. Разгортванню соцыялістычных метадаў працы ў цэху партыйная ячэйка надае вельмі вялікае і сур'ёзнае палітычнае значэнне. Соцспаборніцтва праводзіцца непасрэдна ў брыгадах, паміж брыгадамі і персанальна паміж рабочымі.

Так у комсамольскай брыгадзе спаборнічаюць ГЕНІН, ШЭЦЕРАЎ, КРЫЖЭВІЧ, ВОСІПАЎ.

ДЛЯ ТАГО, КАБ ДАВЕСЦІ ЛЕПШЫЯ ВЫНІКІ СПАБОРНІЦТВА ДА ВЕДАМА ЎСІХ РАБОЧЫХ ЦЭХА І ЗАВОДА, У НАС АРГАНІЗАВАНА АГУЛЬНАЯ ДОШКА ХОДА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ПАСЛЯ КОЖНАЙ ЗМЕНЫ ВЫСТАЎЛЯЮЦЦА ПАКАЗАЛЬНІКІ АБ КОЛЬКАСНЫМ І ЯКАСНЫМ ВЫКАНАННІ ПЛАНА. Паказальнікі зменяюцца строга аперацыйна, зараз жа пасля работы і гэтым вельмі заахвочваюць рабочых да ўдзела ў спаборніцтве.

Усяго ў нашым цэху работае 205 чалавек. З іх ударнікаў 120 чалавек, якія сістэматычна выконваюць прамфінплан, не даюць брака.

КОНЮХАЎ (з месца): у нашай ячэйцы ў час чысткі 3 чалавека пераведзена ў спачуваючыя,—вось і раскажы тав. Плавінскі, якая работа праводзіцца сярод іх.

Плавінскі: сярод іншых у спачуваючыя быў пераведзен тав. Бляхман. Ён быў палітычна зусім не падрыхтаваным і не выконваў вытворчых норм. Пасля чысткі я рашыў узяць яго на буксір. Узяў. Праводзіў з ім некалькі раз гутаркі аб задачах комуніста па вытворчасці, аб тым чаму пераводзяць з членаў партыі ў спачуваючыя. Пасля гэтага мне ўдалося ўцягнуць тав. Бляхмана ў кандыдацкую школу і дабіцца, каб ён акуратна наведваў заняткі. Зараз тав. Бляхман вучыцца, павышае свой палітычны ўзровень. Павышаючы веды, рыхтуецца да таго, каб зноў стаць членам партыі і трэба сказаць, што на вытворчасці па выкананні вытворчых норм ён зараз займае месца ў радах перадавікоў. Калі да чысткі тав. Бляхман выконваў прамфінплан на 85 % і самае вялікае на 90, то зараз за кастрычнік ён даў 105 проц. выканання нормы.

Але трэба прызнацца, што такую работу мы правялі толькі з тав. Бляхманам Сярод астатніх кандыдатаў партыі і спачуваючых мы спецыяльна работы дагэтуль не праводзілі і пэўным неадкладным пярвейшым абавязкам з'яўляецца разгарнуць сталую сістэматычную выхаваўчую работу сярод кандыдатаў партыі і спачуваючых. Ячэйка ў бліжэйшы час павінна дабіцца таго, каб кандыдаты і спачуваючыя былі ахоплены партыйнай вучобай і ўцягнуты ў актыўнае партыйнае жыццё. Гэта партыйная ячэйка неадкладна зробіць.

З работ грамадскіх арганізацый мы можам пахваліцца толькі ячэйкай МОПР, старшынёй якой з'яўляецца тав. Шашкоў. Па лініі ячэйкі МОПР праводзіцца досыць акуратна гутаркі і інфармацыі аб міжнародным становішчы і задачах мопраўскай арганізацыі. Ячэйка МОПР нашага цэха лічыцца лепшай сярод астатніх ячэек нашага завода і трэба сказаць, што па праву. 85 проц. агульнага склада рабочых цэха ахоплены членствам МОПР'а, жыва цікавяцца работай ячэйкі, акуратна выплачваюць членскія ўзносы, не маюць запазычанасці.

Бюро партыйнай ячэйкі ў дапамогу тав. Шашкову для паслення мопраўскай інтэрнацыянальна - выхаваўчай работы ў цэху вылучыла дадаткова двух членаў ячэйкі, стала дапамагае і кіруе работай ячэйкі МОПР. Так на працягу апошняга месяца мы два разы на бюро слухалі інфармацыі тав. Шашкова аб рабоце ячэйкі.

Голас з месца: Аб партыйна-масавай рабоце гаворыш, а вось тав. Плавінскі комсамол чамусці абыходзіш.

Плавінскі: Правільна З раз аб комсамоле. Толькі рэнней хачу расказаць аб адной каштоўнай ініцыятыве: шэфства старых кваліфікаваных рабочых над маладымі, якое зараз шырока падхоплена і разгорнута на ўсіх астатніх прадпрыемствах—ініцыятыва нашай ячэйкі ЛКСМБ.

Першым узяў шэфства т СІНЕЛЬНІКАЎ кавель на кавальнай машыне „Аакс“ над НОВАСЕЛЬЦАВЫМ, які тады работаў падсобным чорнарабочым у нашым кавальным цэху. Зараз, у выніку шэфства, тав. НОВАСЕЛЬЦАЎ добра дасканала аўладаў тэхнікай, работае самастойна, перавыконвае прамфінплан, за кастрычнік напрыклад ён норму выканаў на 115 проц., не дае брака і цяпер ужо ў сваю чаргу ўзяў шэфства над новым маладым рабочым.

Ці вось, тав. ЛАТЫШЭЎСКІ—герой першай пяцігодкі. Ён узяў шэфства над комсамольцам т. СІДАРЭНКА, які не ўмеў работаць на паветраных молатах. Зараз тав. СІДАРЭНКА добра аўладаў тэхналагічным працэсам, выконвае норму на 105—110 проц., не дае брака.

Гэты вопыт мы ў сваім цэху множым Зараз мы разгарнулі вялікую работу па тэхвучобе. А для большага заахвочвання разам з вывучэннем тэарытычных ведаў праводзім практычную работу з займаючыміся ў гуртках па аўладанні тэхнікай. Пасля гэтага мы абвесцілі, што будзе ўтворан тэхнічны экзамен і тыя, хто вытрымае яго, атрымае адпаведнае павышэнне разрада. Усё гэта справажаецца едзінаднай масава-растлумачальнай работай і таму зараз мы маем вялікі масавы прыток ў гурткі тэхвучобы, якімі кіруюць у нашым цэху інжынерна-тэхнічныя работнікі нашага завода.

А зараз аб комсамоле. У нашым цэху існуе комсамольская ячэйка, якая налічвае 26 комсамольцаў. Арганізаваны 2 маладзёжных комсамольскіх брыгады: ГЕНІНА і ВІНАГРАДАВА. Абодвы яны ўдарныя, лепшыя з лепшых. паказваючыя ўзоры барацьбы. Брыгада Геніна выконвае прамфінплан на 150 проц., не дае брака Брыгада Вінаградава ў спаборніцтве з брыгадай Геніна нікалькі ад тае, але таксама сістэматычна прамфінплан перавыконвае дае не ніжэй 120 проц і зусім не мае брака.

Партрымацаваны тав Цярковаказвае сталую дапамогу і ячэйцы. Я павінен сказаць, што мы партрымацаваным не абмяжоўваемся Партыйная ячэйка праз партарго і комувістаў не комсамольцаў стала кіруе і дапамагае комсамольскай ячэйцы.

Усе комсамольцы ахоплены палітвучобай і мы дабіліся таго, што ўсе яны акуратна наведваюць заняткі.

Чырвоная дошка завода па партвучобе запоўнена комсамольцамі нашага цэха, як перадавікамі ударнікамі учобы, якія стала сістэматычна наведваюць заняткі.

Комсамольцы абодвух брыгад здалі тэхнічны экзамен па тэарытычным ведам і зараз стала ўпарта работаюць, рыхтуюцца да здачы практычнага экзамена.

Комсамольцы ў нашым цэху—лепшыя энтузіясты грамадскай работы. 21 гэтага месяца праводзіўся комсамольскі суботнік. Ён прайшоў з вялікім уздымам. Аб гэтым гаворыць той факт, што за частку комсамольцаў, якія па розных уважлівых прычынах не змаглі з'явіцца на суботнік, іх часы адработалі астатнія комсамольцы.

Пара слоў аб нашай цэхавой газеце. Я заканчваю. У нашым цэху выходзіць штод ёнка, назва якой „За работу пановаму“. Штодзённа аперацыйна паказвае выкананне прамфінплана, вылучвае перадавікоў, сапраўдных ударнікаў, ды не толькі фатаграфуе, а абагульвае вопыт іх работы, м тады ўдарнікаў робіць здабыткам усіх рабочых цэха.

Зараз у нашым цэху разгарнуўся вытворчы паход імя тав. Гікало Брыгада за брыгадай уключаюцца ў гэты паход. Штодзённа аперацыйна паказвае ход гэтага ўключэння.

З усяго, што мной было тут сказана відаць, што партыйна-масавая работа ў нашым цэху праводзіцца, але з ўсёй праматой трэба адзначыць, што мы яшчэ канчаткова не перабудаваліся, не ажыццявілі поўнасцю пастанову ЦК „аб становішчы віцебскай партыйнай арганізацыі“ і гаркома партыі аб перабудове партыйна-масавай работы ад 22 жніўня г. г.

Партгрупы і Дыкмана і Дынфельда ў нас яшчэ слаба работаюць, парторгі не вядуць дзённікаў, не ведаюць дасканала жывых людзей, з якімі ім прыходзіцца работаць у брыгадзе, на вытворчым участку.

Замацоўваючы дасягнутае наша баявая, неадкладная задача больш упарта, рашуча ўвяцца за справу і канчаткова, на аснове пастановы ЦК КП(б)Б „аб становішчы віцебскай партарганізацыі“ і гаркома КП(б)Б аб 22 жніўня перабудаваць партыйна-масавую работу ў цэху, брыгадзе, змене.

* * *

Старшыня: Для наступнага слова ў завочных спрэчках трэба падрыхтавацца тав. АВЕРБУХУ сакратару партыйнай ячэйкі рантавага цэха.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ СТАЛІНСКАЯ ІЛЬНАЭСТАФЕТА.

У ЗАМАСТОЧЧЫ большэвіцкую барацьбу за лён падмянілі АЛІЛУЙСКІМІ дэкларацыямі.

У ДНІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА 3-ГА ЗЛЕТА КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ КРУТА УЗНІМЕМ ТЭМПЫ ПАСТУПЛЕННЯ НА ПРЫЕМАЧНЫЯ ПУНКТЫ ІЛЬНА ВЫСОКАЙ НУМАРНАСЦІ.

АБ ХОДЗЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

Пастанова ЦК КП(б)Б па дакладу сакратара Лёзненскага РК КП(б)Б тав. Міцькова.

Не гледзячы на цэлы рад пастаноў і ўказанняў з боку ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб своечасовым выкананні ўсіх работ па ільнапрацоўцы і асабліва па ільназагатоўках, Лёзненская партыйная арганізацыя не перабудавала сваёй работы такім чынам, каб забяспечыць выкананне гэтых указанняў ЦК.

Партыйныя і ас бліва совецкія арганізацыі, а таксама дырэкцыя МТС не зрабілі ўсіх неабходных вываў з неаднаразовых папярджанняў ЦК КП(б)Б аб тым, што цэнтральнай задачай Лёзненскай партыйнай арганізацыі з'яўляецца барацьба за лён. Кіраўніцтва абмежавалася толькі дэкларавaннем таго, каб раён зрабіць вядучым у БССР па ільну, не падмацаваўшы гэтага практычнымі мерапрыемствамі.

Раённыя арганізацыі, палітаддзел МТС і зараз яшчэ не арганізавалі масавай апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве і не мабілізавалі партыйна-комсамольскую арганізацыю, сельсоветы, калгасы актыў і калгасніц-ударніц на большэвіцкую барацьбу за лён. Яны таксама не ўжылі ўсіх вычарпальных мерапрыемстваў, забяспечваючых паспяховае выкананне ільназагатовак, не гледзячы на тое, што іменна ў Лёзненскім раёне больш чым дзе б там ні было меліся і ёсць да таго ўсе магчымасці і ўмовы (самы магутны і стары па ільнаводству раён Беларусі, наяўнасць кваліфікаваных вопытных калгаснікаў па апрацоўцы і прыёмцы ільну і інш.).

Раённыя арганізацыі не зможелі сплучыць работы па выкананню планаў пастаўкі збожжа і бульбы з масавай апрацоўкай ільну і здачай яго дзяржаве, па прычыне чаго гэта важнейшая гаспадарчая палітычная работа ў калгасах была адсунута на больш позняя тэрміны.

У рэзультаце ўсяго гэтага рашаючы ў ільназагатоўках лістапад месяц упушчан, рад паказальнікаў як па апрацоўцы, так і па загатоўцы ільну на 15 лістапада гэтага года па раёну ніжэй, чым тыя ж паказальнікі на гэтае ж число мінулага года.

ЦК адзначае, што ўскрытыя факты і стан работы з апрацоўкай і загатоўкай у Лёзненскім раёне ільну адносяцца адпаўдзена і да другіх раёнаў ільнаводства.

ЦК КП(б)Б патрабуе ад лёзненскага партыйнага і асабліва совецкага кіраўніцтва, а таксама МТС безумоўнага стопроцантнага выканання да ўстаноўленага тэрміна плана загатовак ільнавалакна і ільнасемя як па колькасці, так і асабліва па якасці, зрабіўшы гэту задачу на практыцы баявой, цэнтральнай задачай усёй партыйнай комсамольскай арганізацыі, палітаддзела МТС, сельсоветаў і калгасаў.

ЦК прапануе райкому КП(б)Б, РВК і палітаддзелу МТС неадкладна мабілізаваць усе сілы партыйна комсамольскай арганізацыі, сельсоветаў, калгаснага актыва, калгаснікаў-майстроў ільнавотства і кваліфікаваных ільнатрапальшчыц, калгасніц-ударніц на масавую апрацоўку ільну і на выкананне кожным калгаснікам і аднаасобнай гаспадаркай планаў ільназагатовак, выкрываючы кулацкі саб таж і спробы класавага ворага сарваць апрацоўку і загатоўкі ільну.

Неабходна разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва сельсоветаў, ячэек калгасаў і калгасніц-ільнатрапальшчыц на лепшую апрацоўку ільну і на выкананне кожным калгасам і аднаасобнікам устаноўленага для яго сярэднага нумара ільнавалакна, арганізаваўшы шырокі паказ работы лепшых ільнатрапальшчыц і перадавых калгасаў і аднаасобнікаў, выканаўшых планы ільназагатовак устаноўленай якасці.

ЦК прапануе арганізаваць у кожным калгасе правільнае падсартаванне трасты, правільную арганізацыю яе мяцця, забяспечыць круглагадавую работу ўсіх мяльна-сушыльных пунктаў, прымацаваць да пунктаў спецыялістаў для кантролю за якасцю апрацоўкі ільну і ўстанавіць правільнае размяшчэнне працадзён кожнай калгасніцы, выходзячы з колькасных і якасных паказальнікаў апрацоўкі ільну.

ЦК прапануе райкому партыі і райвыканкому забяспечыць штодзённы кантроль за своечасовай выдачай здатчыкам ільнавалакна і трасты хлеба і за водпускам ільназатчыкам прамтавараў па лініі спажыўкааперацыі, давёўшы да кожнага калгасніка і калгасніцы парадак стымулявання ільнездачы хлебам і прамтаварамі і парадак размеркавання іх сярод калгаснікаў, працуючых на ільнапрацоўцы.

ЦК прапануе раённым арганізацыям дабіцца здачы ільнавалакна якасцю не ніжэй № 10 замест здаваемага № 7 і трасты паўтара нумара замест здаваемага 1,3.

ЦК КП(б)Б папярэджвае аб недапушчальнасці яліх бы там ні было гутарак аб нерэальнасці даных раёну планаў, а таксама з яртае ўвагу на неабходнасць барацьбы з кулацкімі настроямі, якія выражаюцца ў імкненні не здаваць на ільзаводы трасты па ўстаноўленаму плану.

УРАЧЫСТЫЯ АБЯЦАННІ ПЛАСКУНОВА І САПРАЎДНАСЦЬ.

12 лістапада на прэзідыуме Замастоцкага сельсовета асаблівую актыўнасць праявіў старшыня калгаса „Малая ўрачарніца“ т. Пласкуноў, які даў урачыстае абяцанне „да 20 лістапада ільнавалакно самай лепшай якасці здамо дзяржаве“. Ён нават узяў свае паўнамоцтвы крыху шырэй, заяўляючы ад імя ў іх калгасаў, што да 20 ліста пада ўсё ільнавалакно будзе здана, калі толькі на станцыі Замасточча будзе прыёмшчык

На патрабаванне сельсовета гарсовет 17 лістапада выслаў спецыя-прыёмшчыка на станцыю Замасточча. Чатыры дні—з 17 па 21 лістапада знаходзіць гэты прыёмшчык на станцыі, а ільнавалакно не паказваецца За ўвесь час пройдзе толькі адзін калгас «Шчамілаўка» 140 клг, ільнавалакна і то 60 клг. была адпраўлена назад з-за нізкай якасці, а 80 клг прыняты па 6 нумару, бо лён вельмі дрэнна абтрэплен.

Пласкуноў, які так расхваляўся, што да 20 лістапада здасць усе 28 цэнт. ільнавалакна ніводнага кіло не здаў.

ЗУСІМ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ СТАНО ВІШЧА Ў КАЛГАСЕ ЗАМАСТОЧЧА. 16 лістапада тут на партсходзе была прынята пастанова да 19 лістапада здаць 11 цэнт. ільнавалакна, што складае 50 проц. плана. Гэтая пастанова засталася толькі на паперы. Брыгада № 3 яшчэ нават не распачала апрацоўку. У брыгадзе № 4—20 ліста пада толькі распачалі мяць.

Куды варта такая работа, калі пасля новы партыйных сходаў зрываюцца старшынёй калгаса Якімавым, які зай маецца толькі размовамі аб тым, што «здам». Зараз Якімаў знаходзіць «аб'ектыўную» прычыну, што не ведаў, што у Замасточчы ідзе прыёмка ў той час, як станцыя знаходзіцца на тэрыторыі калгаса і ён там бывае па некалькі разоў ў дзень.

Толькі як кулацкі сабатаж з боку Явімава і Пласкунова да апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве можна кваліфікаваць той факт, што за чатыры дні па сельсовету з 211 цэнт. ільнавалакна паступіла толькі 80.

ГРЫНМАН.

Даць валакно не ніжэй 12 нумара.

Калгас «Зорка», Бараўлянскага сельсовета, толькі ў апошні час пачаў апрацоўку ільнатрасты.

Вылучана спецыяльнае звяно з лепшых ударніц па прасушцы ільнатрасты і мяцціе ільна, у якое ўваходзіць Балашова Александра, Багданава і Крыленка Елізавета.

Звяно абвясціла сябе ўдарным і абавязалася ў адказ на заклік рабочых і работніц фабрыкі «Дзіна» даць валакно не ніжэй 12 нумару ў самыя бліжэйшыя дні.

Я. К.

Большэвіцкай барацьбой за лён утрымаць сцяг імя гаркома партыі.

Толькі адзін калгас „НОВЫ СВЕТ“ у Міхалёўскім сельсавеце паказвае ўзоры большэвіцкай барацьбы за лён. Апрацаваўшы ільнатрасту, ён даўно ўжо разлічыўся з дзяржавай, здаўшы валакно 10—12 нумарамі.

Астатнія-ж калгасы, як «Чырвоны ўсход», „Шлях Леніна“, і «Шлях да соцыялізма», імя Варашылава ганебна зацягваюць ільнапрацоўку і здачу валакна дзяржаве.

Калгас «Чырвоны ўсход» 4,4 цэнт. ільнавалакна здаў дзяржаве, а ўсяго павінен здаць 13 цэнт.

Калгас «Шлях Леніна» мае 3,5 цэнт. выпрацаванага валакна, але ніводнага грама дзяржаве ён яшчэ не здаў. Калгас «Шлях да соцыялізма» нават яшчэ не прыступіў да апрацоўкі ільнатрасты.

Калгас імя Варашылава намаў 2,17 цэнт., але дзяржаве таксама нічога не здаў.

Пры такіх тэмпах здачы ільнавалакна Міхалёўскі сельсавет не ўтрымае ганаровага сцяга гаркома партыі.

Калгасы абвяшчаны пакончыць з злачынным мярудзнасцю, арганізаваць круглагадавую апрацоўку ільна і неадкладна здаць яго дзяржаве.

ШАМШУРА.

Зруйнаваць сабатаж апрацоўкі і здачы ільна.

Калгасу «ВЯЛІКАЯ ЧЭРНІЦА», Замастоцкага сельсовета, трэба здаць дзяржаве 22 цэнт. ільнавалакна, калгасу „УПЕРАД“, гэтага ж сельсавета,—7 цэнт Ні першы, ні другі калгас ніводнага грама ільнавалакна яшчэ не здалі.

У калгасе „Вялікая чэрніца“ толькі адна брыгада з 5-ці пачала мяцціе ільна, але ў апошнія дні гэтая работа зусім спынена. Старшыня калгаса ПУХАЎ тлумачыць гэта тым, што не падрыхтаваны яшчэ ільномялкі. „Я ваат не ведаў, што яны паламаныя“ — гаворыць Пухаў.

У брыгадзе МАРГАЎЦОВА, праўда, увесь лён паднят са сцелішчаў, але ляжыць пад адкрытым небам.

Не лепш у калгасе «Уперад». Тут ільнапрацоўка яшчэ і не распачата. Няма падрыхтаваных ільномялак. Не вылучаны групы па ільнопрацоўцы.

У гэтым калгасе надзвычайна разбурана працоўная дысцыпліна. У брыгадзе № 2 з 14 працаздольных калгаснікаў штодзённа выходзіць на работу толькі 4, з 20 калгасніц-жанчын—толькі 8. Старшыня калгаса Балтко з прасцюмлівымі ліберальнічае.

ІРЫНМАН, НОВАЖЭНЕЦ.

НА ІНСТРУМЕНТАЛЬНА-МЕБЛЁВАЙ ФАБРЫЦЫ ІГНАРУЮЦЬ КАЛДАГАВОР.

(ЛІСТ РАБОЧАГА)

Паўтара года рабочыя механічнага цэха інструментальна меблёвай фабрыкі не атрымліваюць вызначаных калдагаворам прадзення і мыла.

Калі звяртаешся па гэтым пытанні да дырэктара ТРЭМБАЛЬСКАГА, або яго намесніка РАСКІНА, то заўсёды чуеш такі адказ:

Пачакайце, хутка будзе.

Але гэтае «хутка» цягнецца паўтара года.

Няма трапак для выціральня рук і варштатаў. Ідзёш рамантаваць варштат, дык хоць аб валасы рукі выцірай

Не прымае мер і прафарганізацыя (старшыня фабкома МЕНХІН)

ІГНАЦІЦКІЎ.

АД РЭДАКЦЫІ.

Не можа быць цярпіма такое становішча, калі адміністрацыя пры прамым патуранні з боку фабкома ігнаруе калдагавор.

„ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ“ чакае безадкладнага ўмяшальства ў гэту справу аддзела аховы працы пры гарпрафсавеце.

ТЫДНЯМІ ЛЯЖАЦЬ ГАЗЕТЫ Ў ШАФАХ СЕЛЬСОВЕТА.

(ЛІСТ КАЛГАСНІКА).

З рук вон дрэнна работае паштовае агенцтва БАРАЎЛЯНСКАГА сельсовета, загадчыкам якога з'яўляецца ІВАНОЎ Пілип. Своечасова калгаснікі газет ніколі не атрымліваюць. Па цэлых тыдзнях яны ляжаць у шафах сельсовета. Так, калгас „ЗОРКА“ толькі 15 лістапада атрымаў першыя нумары газет за гэты месяц.

Дрэнна выконваюць свае абавязкі і лістаносы. Узяць хаця б для прыкладу лістаносца калгаса «Зорка» т. БАГДАНАВУ. Не лічыць яна сваім абавязкам занесці газеты кожнаму калгасніку на кватэру, а кідае ўсе газеты ў канторы калгаса, дзе іх расцягваюць каму не лень.

— Занясіць газеты на кватэры калгаснікаў не мая справа,—разважае Багданава

Арганізаванай падпіскі на газеты сярод калгаснікаў не праводзіцца.

Не шкодзіла б заглянуць у Бараўлянскі сельсавет работніку віцебскага аддзялення саюздруку.

Я. КРЫЦКІ.

З-ЗА НЕПАДРЫХТАВАНАСЦІ ПАМЯШКАННЯ ВУЧНІ ЗАЙМАЮЦЦА ТОЛЬКІ ПРАЗ ДЗЕНЬ.

(ЛІСТ НАСТАЎНІКАЎ).

Да калгаса „БОЛЬШЭВІК“, Бабініцкага сельсовета, прымацавана 4-х камплектовая школа. Праўленне калгаса адпусціла пад школу адзін будынак, які ўмяшчае 70 вучняў. У гэтым жа годзе навучаецца ў школе 143 вучня.

З одна распараджэння сельсовета праўленне калгаса „Большэвік“ павінна было да 1 верасня адремантаваць маючыйся на тэрыторыі калгаса кулацкі будынак.

Старшыня калгаса ДАДОНАЎ і яго намеснік ТРАФІМЕНКАЎ займаюцца балбатнёй, а не справай. Мер да хутчэйшага скончэння будынка яны не прымаюць, хаця матэрыял і рабочая сіла ў калгасе маюцца.

Заняткі ў школе мы спачатку праводзілі ў дзве змены. Але зараз дзень малы і ніяк вельга сумясціць працаёмкую работу школы з падзелам на дзве змены. Зараз дзве групы займаюцца адзін дзень, а дзве групы на другі дзень. Гэта значыць, што калі надалей так будуць праводзіцца заняткі, то палова навучальнага года будзе сарвана.

СЕМЧАНКАЎ, НЕБАРАНА, ВЕЛІСЕЙЧАК, ЯНЧЫЛІНА.

АД РЭДАКЦЫІ:

Старшыня Бабініцкага сельсовета тав. ЯНУШЭВІЧ абавязан неадкладна забяспечыць школу памяшканнем. Вінаватыя ў недапушчальным зрыве вучобы павінны панесці адказнасць.

Барацьба за дзейснасць допісаў—барацьба за дзейснасць самакрытыкі.

АБ ДЗЕСЯЦІ допісах, якія „ЗАМАРЫНАВАНЫ“ т. ДРАГУНОМ.

„Віцебскі пролетарый“ 11 лістапада змясціў ліст рабочага тав. КАЧАНОУСКАГА аб тым, што масты, якія знаходзяцца на вуліцах Пролетарскай, веткі пагнілі. Частку мосцікаў расцягвалі вакольныя жыхары на дровы. І цяпер па вуліцах ні прайсці, ні праехаць. Рабкор тав. ХАНІН у тым жа нумары пісаў, што ў пасёлак «Новы быт» магчыма папасці з горада праз маленькі завулак. Завулак жа гэты прадстаўляе сабою суцэльную жыжу, а з наступленнем восені быў зусім заліт, так што ні праехаць, ні прайсці нельга. На гэтыя лісты не гледзячы на даныя па тэлефону напамінкі, рэдакцыя адказа ад тав. Драгуна не атрымала.

Рэдакцыя таксама не атрымала адказа на перасланыя загадчыку гаркамгасам тав. Драгуну для расследвання ПЯЦЬ неапублікаваных допісаў аб антысанітарным становішчы некаторых двароў па Вагзальнай вуліцы, аб дрэнным становішчы асенізацыйнага абоза (бочкі вельмі малыя і рассохлі ся, без пакрышак, нечыстоты вылі ваюцца на тых вуліцах, па якіх праяжджае абоз), аб адсутнасці асвятлення на праспекце Бебеля. Гаркамгас таксама не адказаў на тры ліста, перасланыя бюро дзейснасці.

Такім чынам дагэтуль гаркамгас не палічыў патрэбным адказаць на дзесяць допісаў.

„Атрыжка“ мінулага, знятага кіраўніцтва гаркамгаса яшчэ і зараз моцна даюць сабе адчуваць у практыцы работы комунальнага аддзела.

Мы патрабуем СВАЕЧАСОВАГА ВЫЧАРПАЛЬНАГА, канкрэтнага АДДЗЕЛАВОГА рэагавання на КОЖНЫ змешчаны ў друку ці перасланы на расследванне допіс.

Нерэагаванне на допісы, альбо прысылку „отписок“ замест прыняцця канкрэтных мер, пролетарская грамадскасць іначай не можа разглядаць, як адну з форм грубейшага заціска пролетарскай самакрытыкі.

Указваючы новаму загадчыку гаркамгасам т. ДРАГУНУ на абсалютную недапушчальнасць гэткіх нядбайных адносін да справы своечасовага рэагавання на сігналы друку, мы чакаем ад яго забеспячэння НА СПРАВЕ, без дэкларацыі, КРУТОГА ПЕРАЛОМА ў кожным звяне апарата гаркамгаса і бок уважлівага, своечасовага і вычарпальнага рэагавання на сігналы друку.

Сяноўна-барскім адносінам да сігналаў пролетарскага друку павінны быць рашуча, не зважаючы на асобы, пакладзен канец!

І тав. Рохкінду трэба праявіць больш аперацыйнасці ў адказах на допісы.

САКРАТАРУ ПАРТКОМА ФАБРЫКІ „СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ тав. РОХКІНДУ 17 кастрычніка за № 1050 рэдакцыяй быў пераслан не апублікаваны допіс, у якім паведамлялася аб тым, што ў тэхнічнай частцы работаюць класава-чужыя людзі, указвалісь канкрэтныя прозвішчы і калі—пісаў аўтар допіса,—аб гэтым было даведзена да ведама сакратара партячэйкі тэхчасці тав. АМБУРГА, апошні пакінуў гэта без увагі. Не гледзячы на тое, што з таго часа прайшло больш месяца і тав. Рохкінду рабіўся напамінак, ён не паведаміў рэдакцыю, якія ім прыняты канкрэтныя меры па перасланаму лісту. Чакаем ад т. Рохкінда паведамлення аб прынятых канкрэтных мерах.

Чакаем паведамлення ад народнага суда па справе былога гандляра Конікава, які збіў ударніка.

У „Віцебскім пролетары“ № 249 пад загалоўкам «Аградзіць ударніка Дзяткіна ад здзекванняў домаўласніка» рабочыя швейнай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі“ тт. БЕЙЗЕР і ІВАНОЎ пісалі, што ўдарнік брыгады закройнага цэха, фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі“ тав ДЗЯТКІН падвергаўся здзекванням з боку домаўласніка—былога гандляра, пазбаўленага выбарчых правоў—КОНІКАВА.

Конікаў у сваіх здзеках даходзіў да таго, што не даваў магчымасцям і Дзяткіна карыстацца прыбіральняй і іншымі комунальнымі ўслугамі. 5 КАСТРЫЧНІКА ДОМАЎЛАСНІК КОНІКАЎ ЗБІЎ тав. ДЗЯТКІНА. Яраслаўна з сакерай, кажучы: «Я цябе ва што бы там ні стала выжыву з дома».

Рэдакцыя газеты «Віцебскі пролетарый» атрымала паведамленне гар

Дні пахода імя т. ГІКАЛО адзначым узмацненнем барацьбы за дзейснасць рацыяналізатарскіх прапаноў.

ВОСЬ яны—ГРОБАКАПАЦЕЛІ рацыяналізатарскай думкі рабочых.

ТОЎСТЫ ПЛАСТ ПЫЛУ нарос на папках рабочых прапаноў на фабрыцы „Дзвіна“.

ГарКК—РСІ павінна сурова пакараць тых, хто марынуе рабочыя рацыяналізатарскія прапановы.

У пакоі дырэктара фабрыкі „Дзвіна“ т. Каплана было спакойна. Сур'ёзна і не спяшаючыся ён пісаў паперу.

— Дык аб якіх прапановах вы гаворыце?

Пэўт раем — Рабочыя прапановы нас цікавяць

— Бачыце—зараз т. Каплан—зараз бюро рацыяналізацыі ліквідавана і яго функцыі п раданы неп срэдна загадчыкам цэхаў.

* * *

Ідзем па цэхах. НОВЫЯ І СТАРЫЯ ВАТЭРЫ—НЕРВ ФАБРЫКІ. Да іх прымацаваны яшчэ мотальны цэх. Звыш 9 рабочых і работніц налічваецца тут. Начальнік цэха тав. ВАСІЛЬЕЎ сцвярджае, што на працягу трох месяцаў паступілі толькі дзве прапановы: адна ад загадчыка падрыхтоўчага цэха тав. ТАРАСАВА якая ўжо прынята, зробл н вопыт і дан заказ рамонтнай майстэрні але затрымка з выробам блочкаў і валікаў і не высылаю слесараў для ўстаноўкі.

Другая прапанова паступіла ад майстра падрыхтоўчага цэха т. Мануйка аб новым метадзе падрыхтоўкі валікаў для мокрых ватэраў, але гэтая прапанова яшчэ не разгледжана.

— А колькі прапаноў паступіла ад рабочых і работніц?

— Ніводнай,—адказвае нам тав. Васільеў.

— А што практычна праведзена па збору рабочых прапаноў сярод рабочых і работніц цэхаў?

— Гаварылі на канферэнцыі—пу вось і ўсё, здаецца...

НЕ ЛЕПШ СПРАВА І Ў СУШЫЛЬНА—УПАКОВАЧНЫМ ЦЭХУ. Ніводнай прапановы за ўвесь час не паступіла, —гаворыць загадчык цэхам тав. АДАМІДАЎ.

ІДЗЕМ У ЧАСАЛЬНЫ ЦЭХ. Як у вас наконт эфектыўнасці рабочых прапаноў?

— А здаецца, што нам нічога не перадавала бюро рацыяналізацыі прыяко рэарганізацыі,—адказваюць адміністратары часальнага цэха.

Дырэктар фармальна правы... Бюро рацыяналізацыі сапраўды ліквідавана, а яго функцыі па загаду перадены цэхам АЛЕ ТОЛКІ ЗАГАДАМ. БО РАБОЧЫЯ ПРАПАНОВЫ, УЛІК ЭФЕКТЫЎНАСЦІ, ПРАТАКОЛЫ ПАСЯДЖЭННЯЎ БРІЗ'а—АДНЫМ СЛОВАМ, УВЕСЬ АРХІЎ БЮРО РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ВАЛЯЕЦЦА Ў КУТКУ НА ПАДЛОЗЕ РАЗЛІКОВАЙ ЧАСТКІ ВАТЭРНАГА ЦЭХА.

С. БАГАРЫ.

Слова мае ТОКАР фабрыкі „Дзвіна“ РАГАЖЫНСКІ для абвінавачвання ГЛУШЫЦЕЛЯЎ рабочых прапаноў.

Праходзячы па цэхах фабрыкі і гледзячы на добрыя рэзультаты маіх уласных прапаноў, я асабліва ўпэўнены ў тое велізарнейшае значэнне рабочай вынаходніцкай думкі і яе дзейнасць, у тым, што рабочы на савецкім прадпрыемстве з'яўляецца сапраўдным гаспадаром.

Увесь свой вытворчы вопыт, энергію і сілу я аддаю на карысць сваёй пролетарскай дзяржавы, социялістычнага будаўніцтва. Немала ўнесены мной рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў далі вялікую эканомію, узнялі ў значнай ступені прадукцыйнасць працы, знішчылі прастоі на пасобных участках і палепшылі якасць нашай прадукцыі.

Па маёй прапанове ў кузні ўстаноўлена цементаваная печка. Унесена мною і праведзена ў жыццё прапана аб устаноўцы патрон для абточкі сухарыкаў рам (у механ. майстэрні) і цэлы рад іншых. Грамадскасць нашай фабрыкі за мае вынаходніцкія і рацыяналізатарскія прапановы прэміявала мяне ўжо тры разы.

Але не гэта з'яўляецца маёй галоўнай мэтай. Пішучы гэтыя радкі, я жадаю завастрыць увагу грамадскасці Віцебска на тых асіднейшых справах, якія маюць месца на нашай фабрыцы. Іменна зараз, у сувязі з уключэннем нашай фабрыкі ў вытворчы паход імя тав. Гікало, неабходна завастрыць увагу, каб найхутчэй знішчыць іх.

Справа вось у чым. Мною была унесена прапанова аб тым, каб зрабіць падъёмнік у істужковым цэху. Прапанова была прынята, быў зроблен вопыт, які паказаў вельмі добрыя вынікі. Па першае гэта аблегчыла працу, на другое вызваліла чатырох рабочых. Здавалася б, што пасля такога ўдалага вынікі вопыта адразу-ж прапанова будзе ажыццяўлена. Але... Яшчэ і да гэтага часа падъёмнік не пусцілі ў ход. Гэты факт не адзіны. Такі ж лёс сустрэлі і наступныя мае прапановы аб тым, каб замест штопак устанавіць гайку в левай разьбой на істужкавых машынах, што вызваліла б слесара і ліквідавала б частыя прастоі, з гэй прычыны, што засмечваюцца галоўкі пры адсяканні шпількі. І гэта яшчэ не ўсё. На істужкавых машынах па прычыне хуткай амартызацыі рам і канцоў васей, знашвання валікаў пры сістэме ўклады шаў якіх на машынах у большасці нама, машыны зусім выходзяць са строя, не кажучы ўжо аб простоях валікаў. Мною была ўнесена прапанова, каб ліквідаваць гэтыя непаладкі і захаваць машыну ад псавання, паставіць валечныя восі на шарыкавыя кольцы замест сухарыкаў і асей, што садзейнічае захаванасці рам, асей, валікаў, дае эканомію масла і звішчае частыя прастоі на бранкеброшах Праведзены вопыт паказаў зноў добрыя вынікі. Але у жыццё правесці гэта, як відаць, няма каму, не гледзячы на тое, што прапанова дана яшчэ ў 1932 годзе.

Прыведу яшчэ адзін абураючы факт. Унёс я прапанову аб устанаўленні праса для насадкі васей на валікі і ні якага адказа не атрымаў (гэта між іншым). А ў красавіку мінулага года мною было прапанавана ўстанавіць акумулятарныя лямпкі для падачы апала ў качагарку і сыравіны ў часальны цэх. Гэта палегчыла б працу, з'эканоміла б вялікую колькасць рабочых, патрэбных для гэтай справы, і стварыла б належныя ўмовы для нармальнай работы.

Пачалася выключная бюракратычная валакіта. На пасяджэнні БРІЗ прапанова была прынята і дан заказ, які не выконваецца і да гэтага часа. У маі гэтага года я атрымаў адказ, што прапанова адхілена. Я пачаў спрачацца і давадзіць, што прапанова каштоўная і матывы БРІЗ не абгрунтаваны, але довады мае былы загадчык БРІЗ'а Кац і слухаць не жадаў. Нарэшце па гэтай справе прыбыла камісія ЦК саюза тэкстыльшчыкаў з Масквы, якая прызнала прапанову каштоўнай. Следам за ёй прыбыла камісія Віцебскага гарМБІТ'а на чале са старшынёй совета вынаходнікаў, якая таксама прызнала прапанову каштоўнай. Аднак, прайшло ўжо больш за паўтары гады, а каштоўнейшая прапанова марынуецца

РАГАЖЫНСКІ.

Токар механічнай майстэрні фабрыкі „Дзвіна“, (вытворчы стаж 22 гады).

На фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі“.

100 пахаваных у фабкоме рабочых прапаноў.

НАМЕЦІЎШЫЙСЯ Ў АПОШНІЯ ДНІ ЗРУХ У СПРАВЕ СКАРЫСТАННЯ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАМАЦАВАН.

Эканаміст БРІЗ'а, эксперыментальная група (слесары, токары, мадэльшчыкі, цесляры і інш.), аддзел і бюро вынаходніцтваў, аддзел і бюро рацыяналізацыі—вось досыць блытаны па сваёй арганізацыйнай структуры апарат БРІЗ'а на фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі“ да апошняга часа.

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прызнаваў перанесці тэхнічнае кіраўніцтва непасрэдна у цэх. З 1 верасня на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» грамоздкі апарат БРІЗ'а быў рэарганізаван. Функцыі яго перайшлі непасрэдна да начальнікаў цэха. Рацыяналізатарская прапанова рабочага ідзе непасрэдна да начальніка цэха, які адказвае за рэалізацыю яе у жыццё Больш складаныя рацыяналізатарскія прапановы ідуць на вырашэнне у БРІЗ, (загадчык БРІЗ'а т. Пазняковy).

Такая перабудова работы БРІЗ'а павінна была павялічыць паток рабочых прапаноў, іх хутчэйшую рэалізацыю і ажыццяўленне.

Аднак, калі за трэці квартал паступілі 62 рабочых прапановы, з якіх 20 прынята, 14 рэалізавана, 38 адхілена і 4 знаходзяцца у стадыі вырашэння, то ў кастрычніку (пасля перабудовы работы БРІЗ'а) паступіла ўсяго 14 рабочых прапаноў, з якіх прынята 6, рэалізавана 5, адхілена 5 і 3 ў стадыі вырашэння. Такое нездавальняючае становішча тлумачыцца выключна тым, што ў сувязі з перабудовай, работа БРІЗ'а аказалася закінутым участкам Фабком і партклектыў не сачылі за тым, каб адначасова з перабудовай работы усёй фабрыкі яшчэ больш ажывіць работу БРІЗ. БРІЗ зараз на фабрыцы знаходзіцца ў беспрытульным становішчы.

КАПЛАН ІГНАРУЕ РАБОТУ БРІЗ'а.

Начальнік бручнага цэха Каплан, на якога, згодна перабудовы работы БРІЗ'а ўскладзена адказнасць за паступленне і, рэалізацыю рабочых прапаноў яўна ігнаруе даручаную яму работу Ніводная рабочая прапанова за апошні час па бручнаму цэху не паступіла Паступіўшыя яшчэ паўтары месяцы назад дзве рабочыя прапановы мярчынуюцца і да сённяшняга дня. На неадзнаразовыя запытанні загадчыка БРІЗ тав. Пазнякова аб лёсе гэтых прапаноў, Каплан адхіляўся ад прамога адказа і нарэшце ўсё ж прызнаўся, што ён згубіў іх. Разам з імі ён згубіў усе інструкцыйныя, вучотныя і іншыя карткі БРІЗ'а

Такім чынам, работа па ўцягненні рабочых у работу па ўдасканаленні абсталявання і машын зусім заглохла. Неадзнаразова аб гэтым пісалася ў шматтыражцы, але пакуль што ніякага зруху няма. Ні цэхавы камітэт, ні цэхавая партыйная ячэйка візднаваць не займаюцца гэтым пытаннем, не прымаюць ніякіх захадаў, каб ажывіць гэту работу.

У ФАБКОМЕ МАРЫНАВАЛАСЯ БОЛЬШ СТА РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.

Загадчык адзіслам БРІЗ тав. Пазнякоў хадзіў ад аднаго начальніка цэха да другога з адным і тым-жа пытаннем: колькі прыбыла рабочых прапаноў за кастрычнік і пачатак лістапада?

Ніводнай вярам яго абдаваў адказ начальнікаў цэхаў і тэхчастак, што ніводнай прапановы не паступіла. І толькі выпадкова ён заглянуў у фабком. Старшыня фабкома ДЫМАНТ на запытанне наконт рабочых прапаноў, спакойна паказаў яму рукой на сідзячую каля пішучай машынкі сакратарыцу фабкома. Там у скрынцы стала, дзе яна сядзела, у папцы ляжала больш 100 складзеных рабочых прапаноў!

Як яны туды папалі?

А справа ў тым, што ў сувязі з падрыхтоўкай да XVI галавіны Каст рычніцкай рэволюцыі і Ўсесаюзнага сакага злёта ўдарнікаў якасці і ашчадлівага тэхнікай фабком правёў масавы збор рабочых прапаноў. Сабрана больш 100 прапаноў, з якіх многа рацыяналізатарскага характару, якія прынеслі б вялікую эканомію. Але старшыня фабкома Дымант паклаў іх у папку і замкнуў у скрынцы. „На ўсякі выпадак“ ён іх паклаў. Можа хто прыдзе, пажадае азнаёміцца з «праведзенай» работай у галіне рацыяналізацыі.

Такім чынам, больш 100 прапаноў былі замарынаваны ў папках фабкома і толькі дзякуючы ўпартасці новага загадчыка БРІЗ'а тав. Пазнякова яны былі знойдзены і ўжо зараз праводзяцца ў жыццё.

ФАБКОМ КІРУЕ БРІЗАМ ПА-КАМПАНЕЙСКІ.

Толькі калі быў абвешчан месячнік рэалізацыі рабочых прапаноў фабком фабрыкі звярнуў увагу на работу БРІЗ'а. Былі арганізаваны гурткі вынаходніцтваў па цэхам, заработалі цэхавыя камітэты у галіне кіраўніцтва імі, быў заслухан на фабкоме даклад старшыні совета вынаходнікаў, прыняты канкрэтныя прапановы для палепшэння работы вынаходніцтваў і БРІЗ,а. Але гэта было толькі у час месячніка. Прайшла гэтая кампанія і фабком запамятаў аб работе БРІЗ'а, спынім кіраўніцтва ім і вось ужо больш трох месяцаў, як ніводнага раза не заслухоўваў аб яго рабоце на пасяджэннях.

Не кіруюць і цэхавыя камітэты вынаходніцкімі ячэйкамі. Ячэйка вынаходнікаў бручнага цэха амаль вусім не працуе. У сувязі з перабудовай работы усёй фабрыкі, старшыня цэхкома т Берман быў пераведзен на другі участак работы. Старшыня цэхавога камітэта Кітушэнка ўсё яшчэ не выбраў новага старшыню ячэйкі вынаходнікаў, не гледзячы на тое, што совет вынаходнікаў рэкамендаваў для гэтага т Ол хінда, які вялоў-бы справіцца з гэтай работай.

У АПОШНІ ЧАС НАГЛЯДАЕЦЦА ЗРУХ У РАБОЦЕ.

Толькі у апошні час на фабрыцы наглядаюцца першыя крокі ў галіне палепшэння работы БРІЗ'а і совета вынаходнікаў. На 20 лістапада паступіла 23 рабочых прапановы, г. зн у два разы больш чым у кастрычніку (у кастрычніку паступіла 13 прапаноў), ажывілася работа ячэйкі вынаходнікаў у вагонным цэху (Вяржбіцкі), дзе праводзіцца кантроль рэалізацыі рабочых прапаноў.

Разгарнуў работу па збору рабочых прапаноў закройны цэх і аддзел тэхчасткі Рабочыя Вайноўскі, Дзержынскі, Птушэнка ўнеслі рад каштоўных прапаноў, якія далі многа эканоміі.

Для ўзмацнення сваёй работы БРІЗ фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі“ наладзіў сувязь з БРІЗ'ам фабрыкі „Прафінтэрн“ і асобнымі вынаходнікамі гор. Сормава. З фабрыкі «Прафінтэрн» перанесен вопыт устанаўлення машынкі для вывёртвання фляспікаў З Сормава вынаходнік тав. Ятыцкі прыслаў ліст з прапановай, па перакваркутыцы прэсаў, што дасць вялізарнейшую эканомію.

У адказным лісту яму было даручена складзі чэр яжы і распрацаваць дэтальны план перакваркутыцы.

Зараз знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі рабочым Бічкоўскім прапанова аб устанаўленні аўтаматычных масляк для ўсіх цэхавых машын, што дасць магчымасць раўналежнага і эканомнага выкарыстання масла. Так сама распрацоўваецца рабочым Птушэнка прапанова аб гузікавай машыне, якая на днях ужо будзе гатова і рад іншых.

Задача ўсяго рабочага калектыва фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» умацаваць першыя поспехі у галіне работы БРІЗ'а, разгарнуць пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі масавую работу ў галіне ўдасканалення новых машын і абсталявання, дабіцца большага патока рабочых прапаноў і іх хутчэйшага правядзення ў жыццё.

А. БРЫСКІН.

ЯК Я ДАПАМОГ ФАБРЫЦЫ З'ЭКАНОМІЦЬ ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ.

Ніводная тамбурная машына фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі“ не працуе зараз пры дапамозе ланцугоў. Замест іх машыны прыводзяць у рух дышлы.

Гэта замена хавае ў сябе ўпарты шлях развіцця рабочых вынаходніцтваў на фабрыцы, і ў прыватнасці адданасць, здольнасць вынаходніка слесара-механіка тав Птушаненка. Яшчэ адна машына характарызуе работу тав. Птушаненка—гэта пецельная машына ў бручным цэху. Чатыры такіх пецельных машыны працуюць у бручным цэху. Тры замежныя і адна машына, зробленая т. Птушаненка. Кожны тыдзень адну з трох замежных машын магчыма заўважыць у рамонтнай майстэрні фабрыкі. А машына, зробленая механікам Птушаненка з прастога корпуса 31-класнай машыны, на працягу больш трох месяцаў не патрабуе рамонта.

Як ён гэтага дабіўся, як работае БРІЗ і як пастаўлена справа з рабочымі прапановамі на фабрыцы, тав. Птушаненка хоча расказаць.

СЛОВА МАЕ РАБОЧЫ-ВЫНАХОДЦА т. ПТУШАНЕНКА.

З самага пачатка сваёй работы ў галіне выняходства я рашыў перавесці ход тамбурных машын 31 класа з ланцугоў на дышлы (на ланцугах яны хутка псуюцца, патрабуюць частага рамонта). Дзеля гэтага патрабаваліся два карпусы першаклаcнай машыны, але механік Мінкін не даваў іх „Не дам псаваць карпусы“,—казаў ён. І толькі дзякуючы механіку Якушава, я нарэшце дабіўся атрымання двух карпусоў.

Працаваў я не ў рабочы час з дапамогай комсамольцаў брыгады Файнштэйна. Праз 6 месяцаў машына была гатова. Тры месяцы яна праваляла ся ў майстэрні, без прымянення

У сувязі з павялічэннем выпуска прадукцыі, на нашай фабрыцы павялічылася і нагрузка на тамбурных машынах. Але тамбурныя машыны на ланцуговым ходу не змаглі вытрымліваць такую нагрузку і штодзённа выходзілі са строя, патрабуючы рамонта. Узялі для пробы зробленую мною машыну, якая прарабоцала тры месяцы без усялякага рамонта. Тады ўжо паўстала пытанне аб неабходнасці перавесці ўсе машыны на дышлы (раней не адважваліся).

Пасля гэтага я пачаў працаваць на пятлёзачнай машыне. Замежныя пятлёзачныя машыны (дзве сістэмы «Дзюркоп» і дзве «Мундлос») больш часа бывалі ў рамонце чым у рабоце. Гэта пагражала стварэнню перабоў у рабоце бручнага цэха, які карыстаецца гэтымі машынамі.

Над гэтай машынай я працаваў тры месяцы, але ніяк не мог скончыць яе, бо не хапала часа (ад работы мане не вызвалялі) Тады БРІЗ пачаў ходайнічаць перад дырэкцыяй фабрыкі, каб апошняя вызваліла мяне на некаторы час ад работы і гэтым самым дала магчымасць скончыць пятлёзачную машыну. Дырэкцыя фабрыкі на гэта згадзілася і ў лістападзе 1932 г. я яе закончыў і даў на справабаванне.

Машына адразу апраўдала сябе—ПРАЦУЕ БЕЗ УСЯКАГА РАМОНТА І ПА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ. Тады БРІЗ падняў пытанне, каб і астатнія тры машыны замяніць такімі-жа першая, якую я зрабіў. Так і было зроблена. У сучасны момант ужо гатовы астатнія тры машыны. За гэта я атрымаў прэмію ў 1316 руб. (акрамя прэмій, якія я атрымаў за папярэднія машыны).

Неабходна адзначыць, што БРІЗ не праявіў патрэбнай гнуткасці, дапамогі пры правядзенні ў жыццё рабочых прапаноў Так, напрыклад, ён навет не дапамог мне ў складанні чарцяжоў для зробленых машын. І па сёнешні дзень я ніяк не магу атрымаць аўтарскае пасведчанне на зробленыя мной машыны, а БРІЗ мне ў гэтым не дапамагае.

Толькі ў апошні час БРІЗ пачаў разгортваць работу ў галіне ўдасканалення новых рабочых у справу ўдасканалення абсталявання і машын. Павялічыўся паток рабочых прапаноў і наладзілася хутчэйшае правядзенне іх у жыццё.

Таксама разгарнула работу ячэйка вынаходнікаў у закройным цэху. Зараз арганізаван тэхгурток для 20 вынаходнікаў, які дасць магчымасць рабочым азнаёміцца з новай тэхнікай, вынаходніцтвам, удасканаленнем і г. д.

У сучасны момант апрацоўваю рад рацыяналізатарскіх прапаноў як: з 31 класнай машыны рабію пецельную машыну для строчкі рэйса, пецельны апарат з прарубкай пятлі для любой швейнай машыны. Апрача гэтага я зараз працую над гузікавай машынай, якая будзе у хуткім часе ўжо гатова.

Рабочы механічнага аддзялення фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», ударнік-вынаходца

ПТУШАНЕНКА.

ХРОНІКА ВЫТВОРЧАГА ПАХОДА ІМЯ т. ГІКАЛО.

Фабрыка „Прафінтэрн“.

* 14 ЛІСТАПАДА НА ПАСЯДЖЭННІ ФАБКОМА было абгаворана пытанне аб уключэнні фабрыкі ў вытворчы паход імя т. Гікало. Выпрацаваны канкрэтныя абавязацельствы: матэрыялы нова да 25 снежня выканаць гадавы прамфінплан. Давесці брак па ўсіх цэхах да 0,15 проц. (замест планавых 1 проц.), канчаткова ліквідаваць перабоі. Пашырыць дзіячы сад на 50 асоб. Адрамантаваць 25 рабочых кватэр. Транспарт фабрыкі і ЗРК абавязуюцца вывезці 50 рабочым-ударнікам дровы. Пашырыць стол уд рнікаў да 150 абедаў

* 21 ЛІСТАПАДА ГЭТЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ АБГАВАРВАЛІСЯ НА ПАШЫРАНЫМ ПАРТАКТЫВЕ сумесна з беспартыйнымі рабочымі, дзе ўхвалілі пастанову фабкома аб уключэнні ў вытворчы паход імя т. Гікало.

* 22 ЛІСТАПАДА НА ЦЭХАВЫХ СХОДАХ БЫЛІ РАСПРАЦАВАНЫ МЕРАПРЫЕМСТВЫ выпрацаваныя фабкомам 4 лістапада. Цэх Пліса заключыў соцдагавор з цэхам паліто на лепшае правядзенне вытворчага пахода імя т. Гікало. Унутры цэха Пліса разгорнута соцспаборніцтва паміж істужкамі на асваенне новага асартымента (цэх перайшоў на бумажныя полупаліто замест брук).

* ФАБРЫКА „ПРАФІНТЭРН“ ВЫКЛІКАЕ НА СОЦСПАБОРНІЦТВА на лепшае правядзенне вытворчага пахода імя т. Гікало фабрыку імя Лекерта.

Фабрыка імя Лекерта.

* 20 і 21 ЛІСТАПАДА праведзены цэхавыя сходы па пытанні ўключэння фабрыкі ў вытворчы паход імя т. Гікало.

* 23 ЛІСТАПАДА праводзіцца экзамен на здачу значка „ЗАТ“ работнікамі апарата АТК і 24 ліст пада рабочымі вядучых прафесій.

* ДА КОЖНАЙ БРЫГАДЫ ПРЫМАЦАВАН ЧЛЕН СЕКЦЫІ ІТР для дапамогі брыгадзе ў справе пастаноўкі работы па аўладанні тэхнікай.



Накіруем творчую думку рабочых на рацыяналізацыю вытворчасці, за выкананне заданняў па зніжэнні сабекошта, па палепшэнні якасці прадукцыі

СІЛАМІ УСЕЙ КРАІНЫ НА ДАПАМОГУ ТРАНСПАРТУ!

Кліенты віцебскага чыгуначнага вузла, прымайце выклік трыкутніка завода „Чырвоны металіст“.

АБВЯСЦІМ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ГНІЛОЙ ПАЗІЦЫІ «НЕЙТРАЛІТЭТА».

Сёння «Віцебскі пролетарый» друкуе ліст трыкутніка завода „ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ“ да ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў звязаных з работай чыгуначнага транспарта. Каштоўнасць ліста ў тым, што ён кладзе пачатак рашучай барацьбы кліентуры супроць гнілой пазіцыі „нейтралітэта“ асобных гарадскіх гаспадарчых арганізацый у адносінах да чыгуначнага транспарта.

Направільна і шкодна было-б думаць, што ў дрэнай работе транспарта вінаваты толькі транспартнікі «Вазміце работу кліентуры,—пісала „ПРАВДА“ у перадавой пад загалоўкам «СПРАВА ЎСЁЙ КРАІНЫ».—Колькі тут сакага грубага ігнаравання законных патрабаванняў транспарта, колькі прамога сабатажа»!

Мы тут не будзем паўтараць тых фактаў злачыннага скарыстання транспартных сродкаў і дзяржаўных грошай, аб якіх апавядае ў сваім лісце трыкутнік «Чырвонага металіста». Дададзім толькі да іх слоў, што ў яшчэ большай меры чым «Чырвоны металіст» вінаваты рад кліентаў (ЦРК, шчотачны камбінат і інш.).

Для ілюстрацыі таго, як зрывае кліентура работу транспарта прыведзем толькі пару лічбаў. На 20 лістапада ў прырэйкавых пакгаўзах чыгункі знаходзілася невывезенага кліентурай груза 89 вагонаў, вольнай-жаплошчы з'ставалася толькі для разгрузкі пя і вагонаў. А колькі лішніх гадзін і сутак на віне кліентуры прастойваюць штодзённа на віцебскім вузле так патрэбныя социялістычнай гаспадарцы вагоны!

— «Мы лічым, што ўся кліентура віцебскага чыгуначнага вузла абавязана ўключыцца ў социялістычную дапамогу чыгуначнаму транспарту. Уключыцца ў рашучую барацьбу за тое, каб на нашай віне віне кліентаў чыгункі, не было ніводнай лішняй мінуты прастоя вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай, ніводную лішнюю гадзіну не былі загружаны навалачныя месцы таварнага двара грузам прадпрыемстваў і ўстаноў, ніводнай капейкі дзяржаўных сродкаў не было выкінута на ўплату за прастой».

Большэвіцкага слова і справы чакаюць металісты ад усіх арганізацый горада, звязаных з работай чыгуначнага транспарта. Шырокі водгук на заклік трыкутніка металістаў павінен знайсці месца і на старонках фабрычна-заводскага друка нашага раёна, які павінен актыўна змагацца за акуратную і сумленную работу сваёй гаспадарчай арганізацыі.

Большэвіцкай работай кліентуры дапаможам палітаддзелу чыгункі ў яго барацьбе за хутчэйшы вывад віцебскага вузла з адстаючых у перадавыя.

Ніводнай лішняй мінуты прастоя вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай.

Ліст трыкутніка завода „Чырвоны металіст“ да усіх прадпрыемстваў і устаноў, звязаных з работай чыгуначнага транспарта.

Чыгуначны транспарт уступіў у першую палітаддзельскую зіму, уступіў у час самай напружанай работы. Партыя і ўрад паставілі перад транспартнікамі і перад усімі прапоўнымі Совецкага саюза баявую задачу вывесці чыгуначны транспарт з вузкага месца народнай гаспадаркі на шырокую дарогу. Зіма першага года другой пяцігодкі будзе першым экзаменам транспарту, праверкай яго здольнасці выконваць пастаўленыя перад ім адказныя задачы.

Сёння яшчэ чыгуначны транспарт дрэнна выконвае свае задачы. Многа вінавата ў дрэннай рабоце транспарта і кліентура.

Яшчэ нядаўна завод „ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ“ быў найбольш злосным кліентам віцебскага чыгуначнага вузла. На нашай віне на станцыі затрымліваліся дзесяткі вагонаў па некалькі дзён і нават па тыднях з-за несвоечасовай пагрузкі і выгрузкі. Па дакладзе і больш займалі грузы нашага завода навалачныя месцы станцыі (склады і рампы).

За першае паўгоддзе бягучага года наш завод уплаціў станцыі Віцебск за ахову грузаў і прастоі вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай 58.331 р. 82 к.

Велізарныя сумы штрафаў павялічвалі сабекошт прадукцыі, выпускаемай заводам. Штрафы часта затрымлівалі своечасовую выдачу рабочым зарплаты, своечасовы выкуп неабходных для работы завода матэрыялаў. Значную частку тых сум, якія адпускаліся для выплаты зарплаты і закупкі тавараў, мы злачынна разбазаравалі на ўплату за прастой вагонаў і за загрузку навалачных месц на станцыі.

Зусім яскрава, што затрымліваючы вагоны мы тым самым садзейнічалі зрыву графіка своечасовага следвання цягнікоў і ўнасілі дэзарганізацыю ў работу чыгункі.

За апошні час у нас значна палепшылася справа з выгрузкай і пагрузкай. Раней былі неправільна расстаўлены сілы возчыкаў на станцыі, не было чоткага кантроля з боку заводскіх арганізацый за прыбываючымі ў наш адрас грузамі і своечасовым іх выкупам. Грузы перавазіліся і выгружаліся не ў парадку паступлення, Рабілася зачастую так, што прыбываючыя раней грузы вывозіліся ў першую чаргу, а тыя, якія прыбылі раней на тыдзень—два, вывазіліся пасля.

Мы павялі рашучую барацьбу з злачыннай расхлябанасцю. Прынялі рад адміністрацыйных мер. Знялі з работы загадчыка камерцыйным аддзелам ЯСТРЭМБСКАГА, які нядбайнымі адносінамі да сваіх абавязкаў, выклікаў, вымушаныя прастоі вагонаў на станцыі.

Зараз у нас наладжан кантроль з боку камерцыйнага аддзела за адбываючымі і прыбываючымі ў наш адрас грузамі. Як толькі прыбывае ў адрас нашага завода груз, мы зараз-жа вылучаем транспарт і сачым за тым, каб грузы хутка былі перакінуты са станцыі на завод. З рабочых нашага заводскога транспарта мы арганізавалі спецыяльныя ўдарныя брыгады возчыкаў і грузчыкаў.

Раней працэс пагрузкі і выгрузкі быў у нас зусім абязлічан. Зараз кожны работнік экспедыцыі адказвае за свой участак работы. БЕРАСНЕВІЧ у нас адказвае за пагрузку і наладжанне транспарта для гэтай меты. СІНЯКОЎ адказвае за выгрузку і своечасовую дастаўку грузаў са станцыі на завод. Мы вечарам напярэдадні вывазкі ужо ведаем, што робіцца на станцыі з нашымі грузамі. Ведаючы гэта рэгулюем наш заводскі транспарт.

Ужываннем гэтых мерапрыемстваў мы дабіліся таго, што ў верасні не заплацілі ніводнай капейкі за прастой вагонаў у той час, як у жніўні мы заплацілі 117 руб. 71 кап. У кастрычніку мы ўплацілі чыгунцы за прастой 46 руб. Але гэта павінна быць апошнім штрафам.

Мы вітаем пачын лазоўскай МТС у аказанні практычнай дапамогі чыгуначнаму транспарту. Палітаддзел віцебскай МТС, адгукнуўшыся на выклік Лазоўшчыны, таксама ўзяў на сябе канкрэтныя абавязацельствы па мабілізацыі калгаснікаў на дапамогу чыгунцы ў снегабарацьбе. Для таго, каб дапамагчы транспарту ў наладжванні бесперабойнай яго работы ў першую палітаддзельскую зіму мы ўключаючыся ў социялістычную дапамогу віцебскаму ўзлу і заартаемся да ўсіх кліентаў чыгункі паследаць нашаму прыкладу.

Мы лічым, што ўся кліентура віцебскага чыгуначнага вузла абавязана ўключыцца ў социялістычную дапамогу транспарту. Уключыцца ў рашучую барацьбу за тое, каб па нашай віне, віне кліентаў чыгункі не было ніводнай лішняй мінуты прастояў вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай, ніводную лішнюю гадзіну не былі загружаны навалачныя месцы таварнага двара грузамі нашых прадпрыемстваў і ўстаноў, ніводнай капейкі дзяржаўных сродкаў не было выкінута на ўплату за прастой.

Мы абавязуемся мабілізаваць рабочую масу праз сваю шматтыражку і насценгазеты на барацьбу з кожным, нават самым малейшым выпадкам затрымкі вагонаў.

Мы звярачаемся да саюзтранса з закліком першым уключыцца ў дапамогу транспарту, бо гэта арганізацыя цесна звязана з работай кліентуры і ад яго часта залежыць своечасовая вывазка грузаў са станцыі.

Дырэктар завода «Чырвоны металіст» КАГАН.

Сакратар партклектыва СІМУНІН.

Старшыня заўкома ЛУКНЕР.

Ад заводской шматтыражкі КОНЮХАЎ.

Барацьба за санітарны максімум—справа ўсёй пролетарскай грамадскасці.

Сёння дванаццаты дзень ударнага санітарнага двухдэкадніка.

Ні на адну мінуту не паслабляць, а яшчэ больш узмацніць барацьбу за чыстату і гігіену.

НА КОЖНЫ СІГНАЛ ДРУКУ—ХУТКАЕ РЭАГАВАННЕ, ЗА КОЖНЫМ ПРЫНЯТЫМ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМ ПАВІННЫ СЛЕДВАЦЬ КАНКРЭТНЫЯ, БОЛЬШЭВІЦКІЯ СПРАВЫ ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ САНМАКСІМУМА.

У ДРУГОЙ ДЭКАДЗЕ ПАКАЗАЦЬ БЛІСКУЧЫЯ ЎЗОРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ САНІТАРНАГА МАКСІМУМА.

Рашэнне гаркома КП(б)Б і прэзідыума гарсовета аб працягненні санітарнага дэкадніка высоўвае перад усёй пролетарскай грамадскасцю высокія патрабанні поўнага выканання санітарнага максімума, укаранення яго ў кожнае прадпрыемства, станоўку, клуб і рабочую кватэру. Зараз задача заключаецца ў тым, каб праверыць як ажыццяўляюцца канкрэтныя мерапрыемствы па ўвядзенні ў вытворчасць і быт чыстаты і гігіены, як людзі рэагуюць на канкрэтныя сігналы друку.

Мы ў газеце друкавалі ганебны спіс крыўшчыкаў і сабатажнікаў ажыццяўлення санмаксімума. Праз гэту дошку прайшлі ўжо 23 канкрэтных парушальніка. Зараз ідзе рэйд рабкораў па праверцы рэагавання на нашы матэрыялы. У час рэйда выявіліся агідныя справы, якія гаворыць аб тым, як яшчэ асобныя ўстановы, або арганізацыі глухі да сігналаў друка. Вось узяць гаржылсаюз. Аб апошнім мы пісалі, але прыходзіцца зноў канстатаваць, што на матэрыялы дошкі ганьбы гаржылсаюз не рэагуе, патураючы гэтым парушальнікам санітарнага максімума. Не адстаюць ад ГЖС і каперацыйныя арганізацыі, якія яшчэ слаба ажыццяўляюць правілы санітарнага максімума ў крамах.

За кожным сігналам газеты, за кожным намечаным мерапрыемствам і прынятым абавязацельствам павінны следваць жывыя канкрэтныя справы. Задачай другой дэкады паходу за чыстату і гігіену і з'яўляецца ажыццяўленне гэтых мерапрыемстваў, ператварэнне іх у сапраўды большэвіцкія справы ў барацьбе за ўкараненне санітарнага максімума, у вытворчасць і быт горада і вёскі.

АБ УЗМАЦНЕННІ КРЫМІНАЛЬНАЙ І МАТЭРЫЯЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАЕ КІРАВАННЕ І ЎТРЫМАНКЕ ЖЫЛЛЁВЫХ ПАМЯШКАННЯЎ.

Пастанова Цэнтральнага выканаўчага камітэта і Совета народных камісараў БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Службовыя асобы дзяржаўных, каперацыйных і грамадскіх устаноў, прадпрыемстваў і органі заций, якім даручана кіраванне належачымі паказаным установам, прадпрыемствам і арганізацыям жыллёвымі памяшканнямі (кіраўнікі дамамі, загадчыкі дамамі, каменданты і інш.), у выпадках безгаспадарчага кіравання гэтымі памяшканнямі ня суць матэрыяльную адказнасць за зробленыя ў выніку безгаспадарчасці страты і апрача таго, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці па арт 196 крымінальнага кодэкса.

У такім-жа парадку нясуць матэрыяльную і крымінальную адказнасць за безгаспадарчае кіраванне дамамі выбарочыя члены праўленняў жактаў ЖБКТ.

2 З'ёмшчыкі жыллёвай плошчы за безгаспадарчыя і драпежніцкія адносіны да занятых імі памяшканняў нясуць матэрыяльную адказнасць у размеры нанесеных страт і прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці паводле арт. 253 крымінальнага кодэкса.

Да паказаных з'ёмшчыкаў прадаўляюцца таксама іскі аб высяленні з занятых імі памяшканняў

3. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадскім советам выдаць абавязковыя пастановы, якімі прадугледзець накладанне штрафаў на паказаных у арт. 2 асоб за безгаспадарчае і антысанітарнае ўтрыманне жыллёвай і дапаможнай плошчы, калі такія дзеянні не маюць характару злачынства.

Штрафы гэтыя накладаюцца па актах, складзеных домакіраўніцтвам або органам комунальнай гаспадаркі, у размеры ў першы раз да 10 руб, а ў другі раз да 25 руб. у парадку, прадугледжаным пастановай ЦВК і СНК БССР ад 15 мая 1931 г. „Пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і советаў і пра парадак накладання адміністрацыйных спагнанняў" (З. З. БССР, 1931 г. № 19, паст. 155).

Штрафныя сумы, якія спаганяюцца паводле гэтай пастановы, паступаюць у размеры 50 проц у гарадскі бюджэт на фінансаванне жыллёвага будаўніцтва і 50 проц залічваюцца ў прыбытковую частку кашта рысаў адпаведных домакіраўніцтваў і накіроўваюцца выключна на рамонт жыллёвай плошчы.

4. Абавязаць усе дзяржаўныя, каперацыйныя і грамадскія ўстановы і прадпрыемствы:

а) неадкладна аформіць дагавамі і актамі здачу з'ёмшчыкаў занятай імі жыллёвай плошчы і ў далейшым здаваць жыллёвую плошчу абавязкова па дагаворах і актах;

б) пры выездзе жыхароў, складаць акты аб стане памяшканняў, якія імі ослабяняюцца;

в) правяраць перыядычна (не менш і раз ў год) становішча жыллёвых і абслугоўваючых памяшканняў праз абследванні на месцы і аб усіх пашкоджаннях складаць акты для прыцягнення вінаватых да адказнасці.

5. Абавязаць домакіраўніцтвы прадаўляць да з'ёмшчыкаў жыллёвай плошчы іскі аб спагнанні з іх кошта папсаванай па іх віне маёмасці і ўзбуджаць крымінальныя справы супроць з'ёмшчыкаў, якія безгаспадарча ўтрымліваюць і пазадрапежніцку знішчаюць жыллёвую плошчу з адначасовым прадаўяленнем іскаў аб высяленні іх з занятых памяшканняў і аплаты страт.

6. Абавязаць пракуратуру ўзмацніць нагляд за захаванасцю жыллёвага фонда, прыцягваючы да жорсткай адказнасці службовых асоб домакіраўніцтваў і жыхароў, вінаватых у безгаспадарчым кіраванні і драпежніцкім знішчэнні жыллёвай плошчы.

7. Абавязаць Народны камісарыят комунальнай гаспадаркі і Белжылсаюз па ўзгадненні з Народным камісарыятам юстыцыі выдаць інструкцыю аб парадку ўжывання гэтай пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧЯРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
ЛЯЎКОЎ.

25 кастрычніка 1933 г.

ЗРК завода „Чырвоны металіст" не прыводзіць у чысты выгляд свае крамы.

Пры праверцы становішча чыстаты ў крамах ЗРК «ЧЫРВОНАГА МЕТАЛІСТА» аказалася, што ў прадуктовай краме № 1 паліцы, дзе ляжаць прадукты, брудныя. У антысанітарным становішчы знаходзяцца прылаўкі, пад якімі груды смецця. Абедзенная пасуда працаўнікоў крамы ляжыць пад прылаўкам брудная.

На полках калісці ляжалі селядцы і мыла, ад чаго засталося многа бруду, а зараз там ляжыць бракаваны сыр, нічым не пакрыты.

Калі загадчыку крамы т. Слуцкаму задалі пытанне наконт антысанітарнага становішча ў краме, апошні адказаў што некаму ўбіраць. Гэта ёсць адкрыты сабатаж, нежаданне ажыццявіць санітарны максімум. Слуцкі зваль вае сваю бяздзейнасць у галіне санмаксімума на аб'ектыўныя ўмовы.

У першай палове крамы знаходзяцца прадукты і прамтавары. Прадаўшчыца крамы Раскіна, адпусціўшы запыленыя валенкі, потым брудным рукамі адпускае сыр. Працуе яна ў брудным, засаленай шубе. У краме маюцца халаты, але яны так зроблены, што не ўлязяць на шубы.

У касе, дзе сядзіць касірша т. Зельдзіна, многа смецця, пылу, бруду і поўна паперы.

У мясной краме № 2 прылаўкі ў антысанітарным становішчы. На прылаўку бруд і пясок. Мяса кладуць на гэты прылаўкі, а не вешаюць на крукі.

Некаторыя зрухі ў паляпшэнні санітарнага становішча маюцца ў хлебнай краме № 8. Полкі пасля кожнай змены мыюцца, занавесі вымываюцца кожную пяцідзённу. Аднак і тут недахопаў многа: барэр увесь у пыле, а таксама і печы. Каля печы ляжаць кучы нагарбанага смецця.

Аднак, прадаўшчыца т. Швец самаадпускае хлеб, прымае грошы і вырэзвае талоны. Калі мы запыталі чаму яна адна працуе, то атрымалі адказ, што працавала яшчэ адна, але яе звалілі з работы.

Нельга надалей цярпець такога антысанітарнага становішча ў крамах ЗРК «Чырвоны металіст». Старшыня ЗРК т. Ідыксон павінен безадкладна прыняць рашучыя захады, каб навесці порадак і чыстату ў падпарадкаванай яму крамах, прыцягнуўшы да адказнасці тых загадчыкаў крам, якія сабатуюць ажыццяўленне санітарнага максімума.

Брыгада рэдакцыі «Віцебскага пролетарыя» РАГАЖЫНСКІ, АСКОЦКІ.

Двор, у якім насаджаецца бруд.

У жакце № 12 доўгі час не рамонтуецца і не прыводзіцца ў належны санітарны выгляд двор па Ленінскай вул № 18.

На двары маецца вялікая яма, у якой збіраецца многа нечыстот ад прыбіральняй. Гэтая яма на працягу поўгода не рамонтуецца, у выніку ад гэта а здаволення нельга сядзець у кватэрах. Таксама, не гледзячы на тое, што ў маёй кватэры патрабуецца рамонт (рамонт аконных рам і інш), апошні не робіцца. Праўленне павінна прыняць усе захады, каб у бліжэйшы час ліквідаваць гэтую ненармальнасць.

Пайнік жакта № 12 КАРШАКОЎ.

У асенізацыйным абозе квітнее расхлябанасць.

Не гледзячы на тое, што гаркамгас забараніў асенізацыйным абозам разліваць нечыстоты па вуліцах горада, апошнія працягваюць рабіць гэта па ранейшаму. Прыкладам можа служыць факт, які адбыўся ноччу з 22 на 23 лістапада і з 23 на 24 лістапада па вул. Бабеля 12, трэба гаркамгасу пры цягнуць значнікаў да адказнасці.

А. ШЫНКАРЭНКА.

БАНКЕТ У ГОНАР тав. ЛІТВІНАВА.

Н'Ю-ІОРК, 24. У гонар тав Літвінава адбыўся банкет, арганізаваны „Амерыкана-рускай гандлёвай палатай" і амерыканскім аддзяленнем ВОКС (таварыства культурнай сувязі СССР з заграніцай). У банкеце ўдзельнічала каля 2.000 фінансістаў, прамысловцаў, пісьменнікаў, артыстаў і грамадзян. У арганізацыйны камітэт увайшлі прадстаўнікі віднейшых буржуазных і прамысловых фірм.

З'яўленне тав. Літвінава госці прывіталі ўставаннем і аплодысментамі. Над месцам, дзе сядзеў тав Літвінаў, былі прымацаваны агромадныя сцягі СССР і ПАЗШ. Перад пачаткам банкета былі выкананы амерыканскі гімн і „Інтэрнацыянал". Старшыня „Амерыкана-рускай гандлёвай палаты" інжынер Купер выступіў з прамовай, у якой падкрэсліў значэнне совецка-амерыканскіх адносін. «Імя Сталіна,—заявіў Купер,—увойдзе ў гісторыю, як імя аднаго з найвялікшых правадыроў усіх часоў".

Указаўшы далей на тое, што ў яго маецца разыходжанне ў некаторых адносінах з палітычным і сацыяльным поглядамі Сталіна, Купер далей заявіў: «Я ад усяго сердца захапляюся неверагоднымі, гістарычнымі намаганнямі Сталіна павысіць жыццёвы ўзровень 160 мілённага насельніцтва СССР». Купер падкрэсліў, што ўстанаўленне дыпломатычных адносін з СССР з'яўляецца „найвялікшым дасягненнем Рузвельта". «Рузвельт і Літвінаў,—указаў Купер,—заклалі аснову совецка-амерыканскаму сяброўству. Увесь свет прывітае гэта збліжэнне, як першачарговы фактар міжнароднага міра. Неабходна дабіцца, каб поспех гэтага многагабяцаючага пачынання быў забяспечан назаўсёды. Рузвельт і Літвінаў выразілі палітычныя пытанні да здавальнення абодвух крын. Маюцца ўсе падставы разлічваць, што будзе знойдзена разумнае вырашэнне таксама эканамічных пытанняў».

Далей выступіў прадстаўнік амерыканскага Чырвонага крыжа ў Совецкай Расіі ў 1918 г. РОБІНС, які ў цёплых выразах узадаў павагу Леніну, Сталіну і Літвінаву. Удзельнікі банкета прывіталі прамову Робінса бурнымі апладысментамі.

Сенатар Бора прыслаў тэлеграму, у якой выразіў жаль, што хвароба пазбавіла яго магчымасці ўдзельнічаць у банкеце і выказаў сваё здавальненне па поваду совецка-амерыканскіх адносін.

Абмен лістамі паміж тав. Літвінавым і Рузвельтам.

Н'Ю-ІОРК, 24. Перад адъездам з Вашынтона тав. Літвінаў звярнуўся да Рузвельта з наступным лістом:

„Мой дарагі пан Рузвельт! Пакідаючы ПАЗШ, я надта рад выразіць Вам сваё высокае паважанне і прызнацельнасць за шматлікія праявы ўвагі і сяброўства, якія вы выявілі за час майго пабывання ў Вашынгтоне. Адначасова я выражаю сваю прызнацельнасць ўсяму ўраду і розным мо органам за іх любезнасць і клопаты. Карыстаючыся выпадкам зноў выразіць маю цвёрдую ўпэўненасць, што ўстанаўленне афіцыйнай сувязі паміж абедзвюма краінамі шляхам абмена нотамі паміж Вамі і мной прынясе абедзвюм краінам вялікую карысць і будзе садзейнічаць умацаванню і захаванню міра паміж дзяржавамі, да чаго шчыра імкнуцца нашы краіны. Я ўпэўнен, што іх сумесныя намаганні ўнясуць у галіну міжнародных адносін новы творчы фактар, які прынясе благо чалавецтву.

Прашу Вас прыняць, дарагі пан прэзідэнт, маё найлепшыя пажаданні Вам, вашай сям'і і вашай вялікай краіне

Шчыра Ваш
МАКСІМ ЛІТВІНАЎ".

Рузвельт адказаў на гэта наступнае:

„Мой дарагі пан Літвінаў! Дзякую Вам за Ваш любезны ліст ад 22 лістапада. Спатканне в Вамі даставіла мне вялікае асабістае здавальненне і я веру, што настане дзень, калі я зноў буду мець прыемнасць прывітаць Вас у Амерыцы.

Я спадзяюся, што, звярнуўшыся ў Вашу краіну, Вы перададзіце прэзідэнту Калініну моё прывітанне і найлепшыя пажаданні. Я глыбока задаволен тым, што нашы гутаркі прывялі да аднаўлення нармальных адносін паміж нашымі народамі і ўпэўнен, што гэтыя адносіны з кожным годам будуць етанавіцца больш цеснымі і блізкімі. Супрацоўніцтва паміж нашымі ўрадамі ў вялікай справе захавання міра павінна быць краеугольным камнем працягла сяброўства. Я шкадую, што з прычыны сваёй адсутнасці ў Вашынтоне пазбаўлен магчымасці асабіста з Вамі развітацца і пажадаць Вам добрага і прыемнага шляха, але заверяю Вас, што Вам спадарожнічаюць мае асабістыя гарачыя пажаданні.

Шчыра Ваш
ФРАНКЛІН РУЗВЕЛЬТ".

ЗАПРАШЭННЕ т. ЛІТВІНАВА Ў РЫМ.

Н-Ю-ІОРК, 25. Італьянскі ўрад праз свайго пасла ў Вашынгтоне перадаў тав. Літвінаву афіцыйнае запрашэнне прыбыць у Рым у якасці гасця італьянскага ўрада. Тав. Літвінаў прыняў запрашэнне. 25 лістапада ён выязджае з Н'ю-Іорка ў Італію на італьянскім параходзе.

Паведамленне агенцтва „Стэфані" аб паездцы тав. Літвінава ў Рым.

РЫМ, 25 Агенцтва „Стэфані" паведамляе: „Народны камісар па замежных справах СССР Літвінаў адбыў 25 лістапада з Н'ю-Іорка на барту парахода «КОНТЭ ДЗІ САВОЙЯ» і прыбудзе ў Італію 2 снежня. Па запрашэнні Мусаліні ён спыніцца ў Рыме для афіцыйнага в'зіта».

Адстаўка габінета САРО.

ПАРЫЖ, 24 Пасяджэнне палаты дэпутатаў, якое зацягнулася да позняй ночы скончылася паражэннем габінета САРО Палата большасцю 321 супроць 247 выразіла ўраду недавер'е пры галасаванні артыкула фінансавага законапраекта, які прапановаў павысіць ад 6 да 10 проц. адлічэнні з акладаў заняжаўных служачых у пенсіённую касу. Урад падаў у адстаўку.

На лейпцыгскай інсцэніроўцы.

Ганебны крах паказанняў правакатараў.

ЛЕЙПЦЫГ, 24. У пасяджэнні суда 24 лістапада сведкі БАЙЕР і МАККЕР абаперлі паказанні правакатара Гротэ які сцвярджаў, што на кватэры Барца адбывалася пасяджэнне комуністаў, на якім, у прыватнасці, узнімалася пытанне, звязанае з падпалам рэйхстага.

Паказанні электрамантёра МАЙЕРА таксама нанеслі сакрушальны ўдар сцвярджэнням Гротэ. Майер быў чле нам той самай комячэйкі, што і Гротэ, але ў 1932 годзе быў выключан, бо не вёў партыйнай работы. На пытанні Дзімітрава сведка адказвае, што партыйная арганізацыя не абгаварвала пытання аб тэрарыстычных актах, што нацыянал-сацыялісты нападалі на рабочых-комуністаў і, што апошнія абараняліся. На пытанне пракурора, чаму сведка сцвярджае, што нацыянал-сацыялісты нападалі на комуністаў, Майер заяўляе, што ў пачатку гэтага года ён сам падвяргаўся нападам з боку нацыянал-сацыялістаў, хаця тады ўжо не быў членам компартыі.

Потым дапытваліся кельнеры з рэстарана, у якім Папоў і Танеў былі вечарам 27 лютага. Гэтымі днямі ад былася вочная стаўка кельнераў з Паповым і Таневым, якія ўказалі трох з усіх кельнераў, якіх яны бачылі ў той вечар. Кельнер БОРШЭРТ указвае, што ў той вечар ён сапраўды аб слугоўваў стол, які, па словах Папова і Танева, яны займалі. Аднак, ні адзін з сведак не помніць ці бачылі яны Папова і Танева, бо наведвальнікаў было многа і гэта было даўно. Папоў заяўляе, што ўжо даўно настайваў на вочнай стаўцы з кельнерамі рэстарана аднак яму ў гэтым катэгарычна адмовілі. Вочная стаўка адбылася толькі цяпер, праз 9 месяцаў. І, натуральна, што сведкі маглі забыць яго, Папова і Танева. Прыпыняемы старшынёй,—Дзімітр'ў настойлівае сорабуе высветліць, чаму вочная стаўка з кельнерамі не была зроблена своечасова, што мела-б вялікае значэнне для ўстанаўлення алібі Папова і Танева. Атмасфера становіцца напружанай. Старшыня заяўляе, што не можа „дапусціць на добную крытыку працэса" і спыняе абгаварванне гэтага пытання. Служачы другога рэстарана КРАЎП падцвердзіў, што вечарам у дзень пажара ў гэтым рэстаране быў Торглер і Кенен.

Найбольш цікавы момант пасяджэння —допыт Вейнбергера. Гэты сведка ад бываў двухгадовае зняволенне ў турме. Па яго словах у лістападзе ён сядзеў у камеры радам з камерай Папова. Першыя паказанні Вайнбергер даў следчаму толькі 17 лістапада. Сведка сцвярджае што, з'яўляючыся ўраджэнцам СССР, і ведаючы рускую мову, ён неаднаразова гутарыў з Паповым у турме па рускі. Па словах сведкі, Папоў увесь час заяўляў яму, аб сваёй невіноўнасці ў падпале рэйхстага але нібыта выражаў апасенне, што яго могуць асудзіць за незаконны пераход мяжы ў матах пасягання на скіданне існуючага лада. Папоў нібы-та прызнаўся яму, што неаднакроць без пашпарта бываў у Германіі, перавозіў многа грошай за мяжу і прасіў перадаць па тэлефону гаспадыні кватэры, дзе ён пражываў у Берліне, каб яна знішчыла паперы. Папоў катэгарычна адмаўляе ўсе гэтыя заявы. Ён указвае, што хлусліваюць паказанняў гэтага сведкі можна ўстанавіць хаця-б на падставе таго, што у кватэры ў гаспадыні, дзе ён пражываў, няма тэлефона. Папоў надта абуран сцвярджэннем сведкі аб нейкіх асобных размовах, якія ён, ні быта, вёў з ім. Тады Вейнбергера запытваюць як ён прыйшоў да думкі даць такія паказанні на судзе. Вейнбергер паведамляе, што ў яго ў камеры часта бываў рэферэнт Вольф, яко му ён і расказаў аб такіх разгаворах з Паповым

Торглер заяўляе, што Вольф многа раз бываў і ў яго ў камеры, пры чым указваў, што вывучаў работы па псіхалогіі зняволеных. Ён неаднаразова гаварыў з Торглерам аб працэсе і ў прыватнасці быў у яго ў тыя дні, калі разбіралася пытанне аб бастарах. Вольф бываў на працэсе і быў аб усім інфармаван Вярхоўны пракурор Вергер пратэстуе супроць падазрэння Торглера, што Вольф мог дагаварыцца са сведкай і пабудзіць яго да хлусліваых паказанняў.

У гэты момант падымаецца Дзімітраў. Ён канстатуе, што ў часе працэса Вольф быў таксама ў яго у камеры, прычым таксама гаварыў аб вывучэнні псіхалогіі зняволеных. „Магчыма ён хацеў нешта высветліць,—заяўляе Дзімітраў,—я лічу незвычайным, што такі „вучоны" на працягу двух месяцаў працэса ходзіць да нас і збірае матэрыялы. Відавочна абвіна вачванне не магло атрымаць матэрыялы звычайным шляхам і спрабавала раздабыць іх іншым шляхам". Старшыня рэзка спыняе Дзімітрава, заяўляючы, што ён не павінен дазваляць сабе нападкі на абвінавачанне. Дзімітраў выражае пратэст і надзвычайнае здзіўленне па поваду такіх метадаў вядзення следства.

Паведамленні.

Рэспубліканская камісія па чыстаты паведамляе што 27 лістапада ў г. Віцебску, у гаркоме КП(б)В а 10 гадзіны будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстаты па разгляду апеляцый наступных т.т:

На 27 лістапада: Паўлаў С. М., Данькова П. І, Ловава Х. А., Камісараў С., Эскіна Д. Л., Якушонак Л. Г., Яцкін Г. Е, Еўдакімаў К. Ф, Ямчонка А. Л, Плазіцкі Р. Л., Недлін С. М, Ліўшыц М. В., Вігдэргаўз Б. К., Якаўлеў Е. К, Батхан Б. З. Шнейвас С. Х, Патапава В. А., Самусенкава Г. Я, Гольдзін А. І., Шэйлін, Белікова А. В, Звонкін А. І., Лінкоўскі.

30 лістапада, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканні ГК КП(б)Б, пакой № 4. адбудзецца пасяджэнне партактыву гарКК КП(б)Б па разгляду партпоправу, на якое павінны з'явіцца наступныя таварышы:

Асіпаў В. С. („Сцяг індустрыялізацыі"), Давіцкая, Дземянкоў Г.Ф., Сліпавіч, Самавараў І. Л. (інструм. -мебл фабрыка), Іваноў Г. М, Александраў А. Ф, Мінзеў А. П., Верабёў П. У., Цягуе Ю. І., (завод «Комінтэрн»), Лосеў Б. М., (фабрыка „Прагрэс"), Кібісаў А. Н., Браудэ (УВСР 98), Кандрацэнка Я. Т. (фабрыка імя Лекерта). Булановіч (партком сувязі), Вісімкевіч К. Ф. (лесавод № 13), Камель Г. Т. (фабрыка імя Клары Цэткін), Тэф Ф. М. (Волгандаль).

ПАРТКАЛЕГІЯ гарКК КП(б)Б.

28 лістапада ў 7 гадзін вечара ў Доме комасветы адбудзецца

ПРАПСЕМІНАР ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ КАНДЫДАЦКІХ ШКОЛ ГОРАДА

па тэме: „Усесаюзная комуністычная партыя—перадавы атрад рабочага класа".

Яўка прапагандыстаў абавязкова.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

Па-ударнаму правядзем рэйд КК—РСІ і друку, забяспечым найхутчэйшае сканчэнне ссыпкі насенфондаў і добраякаснае іх захаванне.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД КК—РСІ І ДРУКУ.

Адзначаючы зусім нездавальняючы ход ссыпкі насенных і страхавых фондаў, а таксама недобраякаснага захавання насення, ЦКК—РСІ і рэдакцыя газеты «ЗВЯЗДА» з 25 лістапада па 15 снежня арганізуюць усебеларускі рэйд КК—РСІ і друку для праверкі і дапамогі партыйным арганізацыям у найхутчэйшым сканчэнні ссыпкі насенных фондаў і добраякаснага іх захавання.

Усім райКК—РСІ, райгазетам, газетам палітаддзелаў МТС і совгасаў прапануецца ўключыцца ў рэйд. Для ўдзела ў рэйдзе—прыцягнуць шыро і актыў РСІ, лёгкай кавалерыі, нізавы друк калгасаў і совгасаў і рабселькораў.

Для аперацыйнага кіраўніцтва рэйдам пры РКК—РСІ арганізуецца штаб з прадстаўнікоў КК—РСІ, райгазет, газет палітаддзелаў, РК ЛКСМБ і РВК.

Ход рэйда павінен шырока асвятляцца на старонках нізавога, раённага, палітаддзельскага і цэнтральнага друку.

Райштабам прапануецца засылаць пяцідзённы аперацыйны матэрыял аб ходзе рэйда ў ЦКК і рэдакцыю газеты «Звязда».

ЦКК РСІ, «ЗВЯЗДА».

СПІС КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ ЗАСЫПАЛІ НАСЕННЫЯ І СТРАХАВЫЯ ФОНДЫ І ПАСОЯХОВА ЗМАГАЮЦЦА ЗА ПРАВА АТРЫМАННЯ МАНДАТАЎ НА 3-ці РАЁННЫ ЗЛЁТ КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

5. Калгас „НОВЫ СВЕТ", Міхалеускага сельсовета. Старшыня калгаса т. ЛЕОНАЎ.
6. Калгас „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ", Бабініцкага сельсовета. Старшыня калгаса т. КРЭЙДА.
7. Калгас імя МОЛАТАВА, Шумнянскага сельсовета. Старшыня калгаса т. СЕЛЯЗНЁЎ.
8. Калгас „ПАБЕДА", Веліка-летчанскага сельсовета. Старшыня калгаса т. БАГАВЕНКА.
9. Калгас „БОЛЬШЭВІК", Віцебскага сельсовета. Старшыня калгаса т. ЛАЗАРАЎ.

Брыгады спаборнічаюць.

У адзнаку падрыхтоўкі да 3 раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў брыгады № 1 і 2 калгаса «Пабеда», Веліка лётчанскага сельсовета, спаборнічаюць паміж сабой па абвазе маладога сада і выпляленні скотнікаў. У гэтым спаборніцтве брыгада № 1 адстае ад брыгады № 3, бо бяздзейнічае ў ёй брыгадзір т. Саўланка

Брыгада № 1 абавязана неадкладна падцягнуцца.

Селькор ДЗЯНІСАЎ.

Завяршыць да злёта ўсе с.-г. работы.

У метах завяршэння да 3 раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў аспоўных сельска-гаспадарчых работ у калгасе імя Варашылава, Селюцкага сельсовета, гэтымі днямі была склікана нарада брыгадзіраў, членаў праўлення і актыва калгаснікаў.

Для абмалота астатняга збожжа з 16 га вылучана спецыяльная група з 15 калгаснікаў. Адказным за работу яе вылучан калгаснік Табуноў Маркел. Група атрымала штодзённыя заданні па малацьбе.

Вылучана таксама група з 12 калгаснікаў і калгасніц па апрацоўцы ільнотрасты. Узначальваецца яна брыгадзірам Скрыпчанка.

А. С.

Сёння, у 7 гадзін вечара ў гарКК—РСІ (габінет старшыні)

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА ПА ПЫТАННІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЕЗОНА 1934 ГОДА.

На нарраду ў абавязковым парадку павінны з'явіцца дырэктары і тэхнічныя кіраўнікі ўсіх арганізацый, якія будуць праводзіць жыллёвае, комунальнае, культурна бытовае будаўніцтва, дырэктары і тэхнічныя кіраўнікі будаўнічых арганізацый, галоўныя бухгалтары будуючыхся і будаўнічых арганізацый, а таксама тт КОНІКАЎ і БАНТАР (гарплан), ДРАГУН (гаркамгас) і БУФЕНБЭРГ (белдзяржснаб).

Рэдакцыі газет «ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЯ» і «РАБОЧИЙ» склікаюць 29 лістапада, у 6 гадзін вечара, у Палацы працы (пакой № 11)

АГУЛЬНАГАРАДСКІ СХОД РАБКОРАЎ І РЭДАКТАРОЎ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ШМАТТЫРАЖАК І НАСЦЕНГАЗЕТ.

Парадак дня: Усебеларускі масава вытворчы паход імя т. Гікало і задачы нізавога фабрычна заводскага друку і рабкораў.

Рэдакцыі газет „ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЯ" і „РАБОЧИЙ".

ГАРТЭАТР (Канатная вул). 27 лістапада
Дзярж Яўр. тэатр НКА УССР. у апошні раз
СТЭМПЕНЮ
Шолом-Алейхем.
Білеты ў касе тэатра.

Кіно «1 МАЯ»
СЁННЯ новы гукавы масталкі фільм
АНЕНКАУШЧЫНА
Пачатак 1 сеанса у 6 гадз. веч.

КІНО „СПАРТАК"
З 28 лістапада і ы раз у Віцебску замежны фільм
БАНДЫТКА

«ПРАЛЕТКІНО» 27 лістапада
1 я і 2-я СЕРЫЯ Ў АДЗІН ДЗЕНЬ
СТАЛЁВЫ ЧАЛАВЕК (Чорны канверт).
Пачатак а 6 гадз. 30 мінут.

ВІЦЕБСКІ гарАЗЕТ АТРЫМАЎ НА IV КВАРТАЛ НАРАД на перасяленне ў Біра-Біджан рабочых самой наступн. кваліфікацыі:
краўцоў—2, цесляроў—15, сталяроў—5, каменшчыкаў - 3, пячнікоў—1, штукатураў—1, чорнарабочых—10, лесарубаў -5, лесавозаў—3, смалакураў—4, па ваціннай вытворчасці—2, у калгасы—5, рыбаловаў-спецыялістаў—5.
Аб умовах перасялення даведацца ў гарАЗЕТ (гарсовет, пакой № 3).
1076—2—2

У СУВЯЗІ З ПЕРАДАЧАЙ ВІЦЕБСКІХ ЛЯСНЫХ СКЛАДАЎ ШЫРСПАЖЫВА БКС РАЙСАЮЗУ,
просьба да усіх арганізацый,
якія маюць прэтэнзіі да лесасклада БКС падаць заявы ДА 1 СНЕЖНЯ Г. Г.
Пасля ўказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
1072

Завод „Комінтэрн" Белкультпрамтрэста НКЛП БССР
(вул. Металістаў 8, тэл. 77)
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА УСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ,
што рамонт розных машынных частак будзе вытвараецца ў 1934 годзе выключна па заяўках прадпрыемстваў.
Прадпрыемствы, жадаючыя планава вытвараць рамонт, павінны даць заводу сваю заяўку з далучэннем падрабязнай спецыфікацыі і НЕ ПАЗНЕЙ 30 ЛІСТАПАДА 1933 г., інакш яны будуць пазбаўлены магчымасці своечасова вытвараць рамонтныя работы, якія будуць выконвацца выключна пры наяўнасці на заводзе свабоднага абталявання.
1070—3—2

ГАРБЮРО „САЮЗДРУКА" даводзіць да ведама ўсіх прадпрыемстваў, ФЗМК, навучальных устаноў, клубаў, хат-чытален, дзяржустаноў, што для лепшага забеспячэння друкам на 1934 г. БЮДЖЭТНАЯ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ ПАВІННА БЫЦЬ ЗДАНА ГАРБЮРО „САЮЗДРУКА" І ЯГО ПРАДСТАЎНІКАМ НА МЯСЦОХ НЕ ПАЗНЕЙ 1 СНЕЖНЯ 1933 Г.
Прыём бюджэтнай падпіскі пачнецца. У інтарэсах своечасовага атрымання з першага нумара як газет, так і часопісаў, не затрымлівайце адачу падпіскі!
1048—3—1
Гарбюро «САЮЗДРУКА».

Гарліт № 12. Друкарня „Комінтэрн", Большавіцкая, 10.

Адказны рэдактар А. М. КУРЦІК.